Дзірка ў неба ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Лён з бел-чырвона-белым сцягам ☞ 4

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 27 (2616) Год LI Беласток, 2 ліпеня 2006 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

ЗАКАЛОТ ВАКОЛ КНІЖКІ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Найбольш кніжкай радавалася моладзь (раздае іх Наталля Герасімюк)

У непрыемнай атмасферы распачалася 21 чэрвеня ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы запланаваная прэзентацыя кніжкі „Забытых таямніцаў чар" — зборніка легендаў, паданняў і аповесцей сабраных у наваколлі Белавежскай пушчы. У музейнай зале сабраліся моладзь, настаўнікі і астатнія ўдзельнікі аднайменнага з кніжкай праекта, у ходзе якога запісваліся аповеды ад жыхароў прыпушчанскіх мясцовасцей. Калі музейны бібліятэкар Наталля Герасімюк выступіла з уступным словам і заявіла: „На жаль, вы не зможаце сёння атрымаць кніжкі", сярод сабраных падняўся гоман і выказвалася незадавальненне. Наталля Герасімюк паспрабавала расказаць сабраным пра цяжкую і марудную працу ўдзельнікаў праекта, плёнам якой стала новае выданне.

Яшчэ зранку, у дзень сустрэчы, дырэктар Ян Карпюк сказаў мне, што музей не прадбачвае прэзентацыі кніжкі і што будзе яна раздавацца пазней. Наталля Герасімюк паінфармавала, што забаронена ёй карыстацца музейнай апаратурай для дэманстрацыі здымкаў з рэалізацыі праекта і заявіла, што дырэктар Карпюк нанёс папраўкі ў выданне і толькі ад яго будзе залежыць ці ў час спаткання будуць раздавацца сабраным кніжкі без ягоных паправак.

— Яшчэ недакончана працэдура выдачы кніжак. Калі яны будуць уведзены на ўлік музея, будуць раздавацца, — тлумачыў прысутны на спатканні дырэктар музея Ян Карпюк і дабавіў, што плануе выпісаць ганаровыя граматы ўдзельнікам праекта.

Наталля Герасімюк паінфармавала, што дырэктар мае засцярогі да прозвішча рэдактара кніжкі (Наталля Герасімюк) і прапануе яе прозвішча замяніць паметкай, што кніжку рэдагаваў музейны калектыў. Пасля дадала, што няма ніякіх засцярог да зместу кніжкі.

— Кніжку стваралі не толькі працаўнікі музея і таму нельга абмяжоўвацца толькі да музейнага калектыву, — гаварыла Наталля Герасімюк.

Пазіцыяй дырэктара не былі задаволены сабраныя, якія патрабавалі раздаць кніжку вучням і настаўнікам, якія былі ўдзельнікамі праекта, яшчэ да канікулаў (а мелі распачацца праз два дні).

Пад націскам публікі дырэктар Ян Карпюк урэшце згадзіўся раздаць кніжку ў час спаткання, што сабраныя ўспрынялі з радасцю. У мяне, як у пастаронняга назіральніка, склалася ўражанне, што спрэчка ідзе пра банальныя справы, а хутчэй за ўсё амбіцыйныя, што гэта справа вызначэння кампетэнцый паміж дырэктарам Янам Карпюком і яго працаўніцай, бібліятэкарам Наталляй Герасімюк, якая шмат напрацавалася ў час рэалізацыі згаданага праекта і падрыхтавала кніжку да друку.

У канцы сустрэчы дырэктар Ян Карпюк заявіў, што вакол справы была „зроблена палітыка" і сродкі масавай інфармацыі будуць мець што апісваць. Я думаю, што лепш было б, калі б не даходзіла да слоўных спрэчак, а закалот вакол кніжкі быў высветлены яшчэ да сустрэчы з моладдзю і настаўнікамі. Не было б тады нагоды абвінавачваць „Ніву", што апісвае сваркі або ізноў крытыкуе, а вучні не мусілі б прысутнічаць у непедагагічных спрэчках. Лепш было б распавядаць аб дасягненнях музея, для чаго неабходнае згоднае супрацоўніцтва ўнутры музейнай установы. Найлепшай дарогай да яго — выбачэнне правінаў і салідная праца замест роздумаў аб мінулым.

Аляксей МАРОЗ

Наша Другая Японія ☞ 2

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

З вялікай радасцю прачытаў я прысвечаны мне асветніцкі тэкст Мікалая Капчука „Каб крытыкаваць, то трэба ведаць" („Ніва", н-р 25). Бо як жа не радавацца, калі аўтар абагаўляе мяне так, што нават майго прозвішча „не приемлет всуе", абыходзячыся „газетным рэдактарам", згодна стараяўрэйскім прынцыпам, якія забаранялі даслоўнага карыстання культавым імем. У мяне за гэта ўдзячнасць спадару Капчуку вялікая і непахісная і запэўніваю яго, што ў маім раю яму гарантавана месца ў прэзідыуме райскага вярхоўнага савета...

Маладыя змагары ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Маладзенькая дзяўчына Хрысціна Шацікава вывесіла нядаўна ў Віцебску на высокай мачце бел-чырвона-белы сцяг. Пасля „выбараў прэзідэнта" ў Беларусі такіх акцый прайшло досыць шмат. Імёны маленькіх герояў, якія змагаюцца за вялікую справу нацыянальнага Адраджэння можна пералічаць доўга...

Са Случанкі ☞ 8

Міра ЛУКША

— Што там такое нарадзіцца ў Беластоку! Хоць я сапраўды тут і нарадзіўся, у бальніцы, — смяецца Ігнат Карповіч. — Так і запісала ў маёй біяграфіі Моніка Шнайдэр, шэфіха выдавецтва: родам я са Случанкі. Гэтак адкрыла: гэта не абы-што — нарадзіцца ў Случанцы. А ў Случанцы цяпер жывуць мае бабулі.

Гэтак адкрываецца перад чытачамі кніжка Ігната Карповіча „Niehalo", якую выпусціла выдавецтва „Чарнэ"...

Прафесар з Уснаршчыны ☞ 9

Раіна СТЭФАНЧУК

Нарадзіўся ён 62 гады таму на Беласточчыне. Дэбютаваў у канцы 60-х. Працуе выкладчыкам у Акадэміі мастацтваў у Лодзі. Тут вядзе адну з жывапісных майстэрняў. Апошняя ягоная выстава ў Беластоку і ў нашым рэгіёне адбылася больш за 20 гадоў таму, хоць выстаўляўся ў іншых рэгіёнах Польшчы і свету. Гэта Мікола Давідзюк...

9 770546 196000

Беларушчына „прарасце”

Лішне было б тлумачыць трывіяльную рэч — найбольшай нацыянальнай каштоўнасцю для нас ёсць наша роднае слова. Чаго найперш шукаюць беларусы блізкага і далейшага замежжа, прыехаўшы ў Беларусь? Менавіта беларускага слова на вуліцах і ў побыце, беларускай культуры ў паўсядзённасці. Таго, што найперш розніць нас ад іншых народаў. Таму для нас не мусіць быць пытання што першасна — нацыянальная мова і культура ці дэмакратыя. Без першага аніякае развіццё дэмакратыі ў Беларусі папросту немагчымае. За што беларусы найбольш не любяць палітычны рэжым Лукашэнкі? Шматразова ад розных людзей з апазіцыйнага руху даводзілася чуць: „Каб ён не нішчыў нашай мовы і культуры, я напэўна займаўся б сваёй справай і да палітычнай дзейнасці і ўсялякіх выбарчых кампаній не меў бы аніякога дачынення”. І гэта, відаць, правільна і справядліва. Лукашэнка меў вялікі шанц (некаторыя лічаць, што і зараз яшчэ мае) стаць сапраўды вялікім беларускім дзеячам. Дастаткова было не зачапаць нацыянальныя каштоўнасці — мову, сімволіку, культуру (многім гэтая сярмяжная думка падасца крамольнай ці прымітыўнай). Але, на жаль, так не бывае. Не тая прырода, не той покліч сэрца ў такіх правадыроў.

І як ты растлумачыш якому-небудзь заходняму замежніку (палітыку, грантадаўцу ці звычайнаму грамадзяніну), што не правы звышактыўных кабет ці сексуальных вычварэнцаў нас хвалююць. А баліць нам зусім іншае. Тое, што ў беларускіх гарадах з нашай гаворкі пачынаюць смяяцца ці кпіць у публічных месцах. Тое, што ў дваццаць першым стагоддзі не маем беларускага тэлебачання (элементы якога былі нават у савецкі час). Тое, што не маем магчымасці аддаць сваё дзіця ў Беларусі (!) у беларускамоўны садок, а пазней беларускамоўную школку. Мой сябра, каб захаваць адзіны беларускамоўны клас у школе, дзе вучылася ягоная дачка, штогод на першага верасня выстаўляў васьмі ці дзесяці бацькам яе аднакласнікаў па бутэльцы гарэлкі. Каб толькі тыя не забіралі сваіх дзяцей з беларускамоўнага класа. Цяпер у Гродне няма магчымасці зрабіць беларускі клас нават такім чынам. Юрыдычна гэта мажліва, а вось практычна... Беларуская мова фактычна вынішчана з вышэйшых навучальных устаноў, вось і кіруюцца бацькі ў сваім выбары выключна прагматычнымі меркаваннямі. Але што мяне здзівіла зусім нядаўна! Нягледзячы на татальную русіфікацыю навучальнай сістэмы, бальшыня абітурыентаў на цэнтралізаваным тэставанні па мове выбрала менавіта беларускую, а не рускую. І гэта прытым, што тэсты гэтыя, па сведчанні філолагаў, складзены надзвычай груваcтка і мудрагеліста. Ёсць надзея, што беларушчына яшчэ не страціла сваіх каранёў, вось і „прарастае” нават там, дзе яе не чакаюць.

Юныя грамадзяне Беларусі вырастаюць патрыётамі сваёй краіны насуперак сістэме. Пра гэта сведчыць і колькасць розных мірных акцый моладзі ў розных гарадах Беларусі. У Мінску на мінулым тыдні група моладзі выйшла на вуліцу з новым для краіны транспарантам — „Рускі салдат ідзі дамоў!” Якраз пад саміт крамлёўскіх кіраўнікоў і залежных ад іх прэзідэнтаў некаторых былых савецкіх рэспублік. Па сённяшніх часах гэта досыць радыкальны пікет. Іншы яскравы прыклад. Маладзенькая дзяўчына Хрысціна Шацікава вывесіла нядаўна ў Віцебску на высокай мачце бел-чырвона-белы сцяг. Пасля „выбараў прэзідэнта” ў Беларусі такіх акцый прайшло досыць шмат. Імёны маленькіх герояў, якія змагаюцца за вялікую справу нацыянальнага Адраджэння можна пералічаць доўга.

Можа таму ўлада хоць у нечым і ўскосна ідзе на саступкі беларускай грамадскасці. Праехаўшыся нядаўна па сталіцы Беларусі, я быў прыемна ўражаны. Усе новыя шыльды на прыпынках і дамах напісаны вялікімі літарамі па-беларуску. Гэта сапраўды выклікае здзіўленне, бо такія праявы беларусізацыі неяк не стасуюцца з генеральнай лініяй дзяржавы. Найгоршыя беларускія справы ў абласных цэнтрах хіба ў Магілёве і ў Гродне, дзе назіраецца найбольшая русіфікацыя. У іншых вялікіх гарадах куды весялей.

Шмат у моўным выхаванні залежыць ад настаўнікаў роднага слова. Да ганебнасці парадаксальна, але многія настаўнікі беларускай мовы самі яе не любяць, а некаторыя нават ёй грэбуюць. Ды што з іх узяць, калі іх у інстытутах і універсітэтах вучылі пераважна правільнаму напісанню суфіксаў і канчаткаў, а не светаглядным каштоўнасцям звыш данага Слова. Адзін Алесь Белакоз выхаваў беларусаў больш, чым увесь Гродзенскі універсітэт. Але гэта ўжо іншая тэма...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Наша Другая Японія

З вялікай радасцю прачытаў я прысвечаны мне асветніцкі тэкст Мікалая Капчука „Каб крытыкаваць, то трэба ведаць” („Ніва”, н-р 25). Бо як жа не радавацца, калі аўтар абагаўляе мяне так, што нават майго прозвішча „не приемлет всуе”, абыходзячыся „газетным рэдактарам”, згодна стараяўрэйскім прынцыпам, якія забаранялі даслоўнага карыстання культавым імем. У мяне за гэта ўдзячнасць спадару Капчуку вялікая і непахісная і запэўніваю яго, што ў маім раю яму гарантавана месца ў прэзідыуме райскага вярхоўнага савета.

На сам пачатак папрашу майго паклоннніка залезці на райскае дрэва пазнання. З яго відаць абшырны ландшафт, на якім народныя масы згрупаваныя ў клеткі. Любімая клетка спадара Капчука, „где так вольно дышит человек”, найбольшая, а насяляючыя яе прыматы, радыя гэтай велічыні, пакорнічаючы з задзертымі рагамі і хвастамі, спяваюць любімыя песні вялікага Іосіфа, напр. Кабзона Давідавіча. А калі загарада гэтай клеткі хістаецца, прыматныя масы, разам са скрыгатам зубоў, рыдаюць пасію-катавасію на словы Мікалая Капчука: „Вялікі Савецкі Саюз рассыпаўся!”

Не толькі Мікалай Капчук захапляўся Савецкім Саюзам, бо захапляцца можна нават кракадзілам, калі паклоннік у бяспечнай адлегласці ад ягоных зубоў, напрыклад, у свой час Шоу ці Сартр у клетцы „астатніх розных”. А вось невядома мне — і буду тут прасіць дапамогі спадара Капчука, які наводзіць парадак з творчым хаосам, кідаючы творы і творцаў у любімыя шчыльныя загарадзі, — да якіх імперскіх клетак аднесці Шульца ці Кафку. Дзеля падказкі прывяду дыялог Генры Кісінджэра з Леанідам Зорыным:

— Вы хто па нацыянальнасці? — спытаў Кісінджэр.

— Я — рускі.

— А я — амерыканскі!

*Цікава, у якую клетку праз свой фільтрацыйны пункт прапусціў мой усёвед Шапэна, які нарадзіўся на зямлі не чужой маскоўскай дзяржаве. Да таго ж ягонае прозвішча палякі пішуць лацінкай Cho**pin** — з ідэнтычным суфіксам як прозвішча Szala**pin**.*

Паміж радкоў спадар Капчук прысвойвае мне высокае званне паланафіла. Не адракаюся ад гэтага гонару, аднак хачу заўважыць, што свае назіранні гэтай дзялянкі мой усёнастаўнік вядзе „с высоты Востока-Белостока”, дзе палякаў нямнога, затое поўна неафітаў у стадыі przepoczwarzania się. Гэтыя апошнія згуртаваныя ў дзвюх фракцыях, большай і меншай; гэта такія тутэйшыя бальшавікі і меншавікі, ды і адносіны між імі складваюцца вельмі падобна як у Петраградзе. Па сутнасці гэта два бакі-блізнюкі аднаго Януса, які вядзе сябе быццам певень перад люстэркам, перачы сябе кіпцюрамі-стэрэатыпамі. Калі б спадару Капчуку захацелася глянуць далей на захад, дык заўважыў бы памяркоўнейшае, чым да пеўняў, зацікаўленне.

Яшчэ пра гамулкаўскую „дзікую” забарону чыгуначных спеваў, пра якую — прызнаюся — я нічога не ведаў, бо заўважаў у тагачасных вагонах найчасцей забароны высоўвацца за акно і карыстацца на станцыях ракавінамі за белаватымі шыбамі.

Спачуваю спадару Капчуку „адлігі” 1956 года, якая растапіла снежна-белага вялікага Іосіфа. Мабыць з-за жалобы па ім забаронена радаснага спявання, асабліва „прыгожых песень суседніх славянскіх народаў”. Калі не так даўно памёр „бацька карэйскага народа” Кім Ір Сен, жалоба па ім доўжылася тры гады. Ці варта дзівавацца, што калі ў 1956 годзе скончыўся „вечно жив” „отец всех народов”, забаронена і ў нас усялякіх пагулянак?

У шасцідзесятых, сямідзесятых, а нават хіба і васьмідзесятых гадах мінулага стагоддзя, у медыях з'яўляліся час ад часу паведамленні, што ў філіпінскіх джунглях знойдзены японскі ваяўнік перыяду другой сусветнай вайны, які яшчэ не здаўся, змагаўся дзесяцігоддзямі за свайго мікада. Не ведаю, ці хто заўважыў, што і ў нас ужо Другая Японія, са сваім самураем, які ўсё яшчэ „готов опять наставить грудь” за свайго імператара і ягоную імперыю.

Я шчыра заклікаю спадара Мікалая Капчука надалей высока трымаць сцяг нашага спадчыннага менталітэту. І з павагай ставіцца да „стапаверхнасных недарэчнасцей”, каб дарма не прападалі ўсяведавы веды, рупліва начытаныя з савецкага друку. Напачатак прашу нейкую грунтоўную, як пра Пушкіна, асвету пра Шапіна і Шаляпіна.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Рэзалюцыя

Ці ў Польшчы фактычна ўзрастае неталерантнасць спрычыненая расізмам, ксенафобіяй, антысемітызмам і гомафобіяй? Трывогу гэтым фактам выказалі ў апошні час дэпутаты Еўрапарламента. Спрычынілася гэта да амаль маланкавага пратэсту польскага Сейма. Дарэчы, польскія еўрадэпутаты з трыбуны ЕП таксама не паддаваліся, асабліва прадстаўнікі г.зв. крайняй правіцы. Багдан Пэнк сцвердзіў, што гэтая рэзалюцыя не можа быць „яшчэ адным ружжом у палітычным змаганні левых і лібералаў супраць правым палітычным партыям і краінам, у якіх правыя партыі перанялі ўладу”. Мацей Гертых у сваю чаргу пераконваў рашучым тонам:

— У Польшчы супраціўляемся распаўсюджванню гомасексуалізму, немаральных паводзін. У зразумелы спосаб адрозніваемся з панам Шульцам наконт таго, што з'яўляецца маральным ці немаральным.

Быў гэта адказ на ранейшае выказванне еўрадэпутата Марціна Шульца, які заявіў:

— Нянавісць да меншасцей, пагарда для іншых рас, асоб непаўнаспраўных і з іншай сексуальнай арыентацыяй давялі б Еўропу да катастрофы фашызму і сталінізму. Жывём у Еўропе, дзе для кожнага ёсць сваё месца.

На маю думку, праблема, якую кранае рэзалюцыя ЕП, не толькі палягае на рэальным узросце нянавісці ў Польшчы ў дачыненні да акрэсленых груп і стаўленняў. Хутчэй справа ў тым, што — як гэта якраз назваў дэпутат Шульц — кожны ў Еўропе мае (а хутчэй — павінен мець) сваё месца. У грамадска-палітычнай практыцы польскіх, хоць не толькі польскіх, правых арганізацый, якія прадстаўляюць дэпутаты Пэнк і Гертых, месца тое знаходзіцца на абочыне грамадскага, публічнага жыцця. А нават і па-за ёю.

Дыскусія, аднак, у еўрапарламенце мела малы сэнс. Вядома, сігналізавала нейкую праблему і, мабыць, фактычна ў выпадку Польшчы яе перабольшыла. Праблема, каб тая дэбата мела якісьці канкрэтны маштаб, спрычынялася да рэальных змен у тым, што ЕП не распараджаецца сумленнымі і сумарнымі данымі на тэму кожнай праявы расізму, ксенафобіі, антысемітызму і гомафобіі. Дэпутаты Патрык Гобер і Багуслаў Сонік былі згодны, што ЕП страціў нагоду, каб на гэтую тэму гаварыць адным голасам, паказаць механізмы, якія павінны быць уведзеныя ў ЕС, такія як пастаянны маніторынг расісцкіх злачынстваў, ажыццяўленне рамачнай дырэктывы і як найхутчэйшае заснаванне Агенцтва асноўных правоў.

— Гэта павінны быць прыярытэты нашай дэбаты, а не зневажанне паасобных краін, — прамаўляў дэпутат Сонік.

Згоднасці еўрадэпутатаў наконт прыняцца рэзалюцыі не было. Прынята была яна пры 301 голасе за, 161 супраць і 102 устрымаўшыміся. Так вось Еўрапарламент праблему прыкмеціў, рэзалюцыю прыняў. Не хапае яму, аднак, інструментаў супрацьдзеяння з'явам апісаным у ёй і то такіх, каб змаганне, напрыклад, з расізмам і гомафобіяй — як успамінаў Патрык Гобер — не было змаганнем ані правым, ані левым. Ды таксама каб не павялічвала яна большай неталерантнасці, а з другога боку недахоп інструментаў для сурацьдзеяння такім з'явам не абазначаў іх адабрэння. Варта спаслацца тут на выказванне еўрадэпутата Войцеха Рышкоўскага:

— Трэба быць асцярожным у параўноўванні і абагульнянні гэтых з'яў у палітычнай барацьбе, паколькі вынік можа быць адваротны ад намеранага і можам спрычыніцца да абвастрэння, а не палагоджання канфлікту. Не трэба блытаць аўтэнтычных праяваў расізму і антысемітызму з апазіцыяй да ідэалогіі, якая прымяняецца ў палітычным дыскурсе.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

ДЗІРКА Ў НЕБА

Фота Уладзіслава ЗАВАДСКАГА

На месцы старой хаткі Макаркавай Гапкі асталася глыбокая яма. Без раслін і жыцця як у пустыні. Сярод шэрай патрэсканай гліны валяецца дзіравы чобат. Ля паваленага, гнілога плота бачу прыладу з часоў сярэдневякоўя — драўляны гарпун. У заваленай студні плавае мёртвы пацук.

— Каго так шукаем, га? — як з-пад зямлі на забытым панадворку з'яўляецца аброслы асобень. Страшнавата, калі падыходзіць бліжэй.

— Я таго... — чамусьці займае мне мову, — я-я фатаграфую... Мой фотааб'ектыў накіроўваецца ў бок сухога дуба, на якім пачэплены стужкі, ручнікі і ўсякія чарадзейныя латкі.

— Гэта прыватная тэрыторыя! — асцерагае мяне незнаёмы, а я адчуваю як нейкая сіла вырывае мне фотаапарат з рук.

* * *

Генік Макаркаў, той аброслы асобень, папраўдзе прылюдны і першы заводзіць гутарку. Кажа, што любіць дзяўчат, якія яшчэ ўмеюць гаварыць *па-своему*.

— Прабач мне, што такі непабрыты, — кажа пра свой нясвежы выгляд. Пасля пакажа сваю гаспадарку: *гэта мой кот, гэта мой ровар, гэта мая крапіва*. Сярод буйнай крапівы, якая распладзілася на панадворку, выглядае яшчэ матацыкль „Ява", сапсаваны ад дваццаці гадоў.

— Няма для каго мне старацца, — быццам на апраўданне кажа стары кавалер. Сапраўды, ахвота выбівацца ў людзі даўно пакінула майго субяседніка. Больш цягне яго ў бок лесу. Праз чарапіцу ягонай мураванкі прабіваецца бяроза, якая вырасла ў запушчаным пакоі. Хлявы і стадолу Генік парубаў на дровы і спаліў у печцы ў час калядных маразоў.

— Сястра ў Беласток забраць мяне хацела, — успаміне, — намаўляла каб *палячам* уладкаваўся, каб новае жыццё завёў. А не як той дзікун па руінах туляўся.

Але Геніку напляваць на тыя гарадскія падвалы:

— У мяне хоць чыстае паветра ёсць!

Пра яду не клапоціцца. Два разы ў тыдзень давозяць яму *пашу* з сацыяльнай дапамогі.

* * *

Неахайнасць, абыякавасць да сябе самога ў Геніка падазроная, на кіламетр чуваць ягоную моц і ўмеласць зачараваць ад галавы да ног. Гэта маскіроўка. Хоць сам Генік Макаркаў клянецца і божыцца, што не ведае чараў, усе ў Н. ведаюць адно — менавіта што ён „нешта ведае"! У бары „Амазонка" празываюць яго *Кашпіроўскім*.

— А як дакранецца да галавы, то *пронд* па спіне ідзе, — кажа барменка Алька. І раіць, каб не патраціць розуму ў яго прысутнасці. — *Бо то такі балдун, што... о-го-го!*

Генік — унук Гапкі Макаркавай.

— Калі ў каровы малако прападзе, або калі конь знаровіцца, то да яго з цэлага свету едуць за радай, — кажа вопытная баба Сонька. Пад лозунгам „з цэлага свету" мае на думцы сваю парафію, у якой пяць вёсак.

— А ёсць у Н. хоць адзін конь? — пытаю ашчырыўшы зубы.

— Нэма, нэма! — чую ў адказ.

Калі ідзе пра жывёлу, у аздараўленні якой спецыялізуецца Генік Макаркаў, дык у Н. зусім няма для яго выклікаў. У хатках, дзе дажываюць самотныя ўдовы, асталіся адны каты пахрышчаныя імёнамі герояў тэлесерыялаў. Час ад часу трапіцца авечка або курка з пеўнем. Лясная звярына, якая шакіруе і наводзіць зайздрасць у суседніх вёсках, чамусьці шырокім кругам абмінае іх вёску.

Праўда, недахоп шкоды ад пушчанскіх дзікоў і аленяў аж пераеўся ў Н. Страхоўкі ад гміны не выдубіш, — наракаюць тут. Вядома, — больш з перасцярогі, каб не пашкодзіць сабе залішняй хвальбой. Кожны ведае жалезны прынцып: калі табе добра — наракай!

* * *

Ніякія знакі на небе і на зямлі не прадказвалі нараджэння такога Геніка. На Гапку, ягоную бабулю, ніхто не звяртаў увагі, — яна замаўляла боль і немач як усе жанчыны з Н. Жыццё Геніка таксама не вылучалася і не адставала ад іншых. Будучы падшпаркам, з сакавіка па лістапад басаногі ганяўся па брукаванай вулачцы, пасвіў кароў і авечак, пасля біўся як усе маладзёны на вясковых забавах. Хоць найстарэйшыя жанчыны, ведалі... Генік не быў просты. Ён нарадзіўся як бізнюк, а гэта ў Н. гарантавала метафізічны поспех. „Будэ тое, шчэ будэ!" — шапталі з надзеяй старажылкі. Ужо быў адзін знак, хоць мала хто ведаў старыя прызнакі. Калі ў тры месяцы пасля нараджэння памёр раптоўна яго брат-блізнюк, уся падараваная сіла перайшла на адну галаву, значыць, на Геніка. Не дарма хлапец вучыўся на адных пяцёрках. Гэта таксама быў доказ: ён ведаў больш чым ведаў! Хоць у той час ён сам нічога не ведаў і не хацеў ведаць, смяяўся з забабонаў і з замоваў бабулі, якая час ад часу ўпамінала духаў, расказвала пра малако кароў, якое забралі зайздросныя вочы.

Фота Уладзіслава ЗАВАДСКАГА

Генік закончыў ліцэй і збіраўся паступаць на *студыя*. Марыў стаць адвакатам і, як бабка, дапамагаць людзям.

* * *

Пра моц Гапкі Макаркавай даведаліся адно ў дзень яе смерці. Раней, як мы ўжо сказалі, яе магічныя практыкі лічылі звычайнай тут штодзённічынай. Але баба Гапка не магла памерці. Што не рабілі ў Н., каб выправіць яе ў лепшы свет! Спачатку маліліся дзень і ноч. Аднак малітвы не дапамагалі. Гапка ляжала на прыпяку і выла ад болю як воўк. (Чулі ў суседняй вёсцы). Калі з'ехаў бацечка, у Н. прыгадалі стары спосаб. Трэба было вырваць дзіру ў страсе хаты. Гэтая практыка ледзь не закончылася смерцю першага выканаўцы магічнай практыкі. Калі падвыпіўшы Уладзік Максімкаў ускараскаўся на дах, яго раптам ірванула і нейкая сіла грымнула аб зямлю. Хлапец ляжаў без дыху на зямлі і здавалася, што канчаецца.

Каб нешчасліўца вярнуць да жыцця, яго доўга *шыкалі-калысалі* ў квяцістай радзюжцы і шапталі замовы. Пасля паспрабаваў узлезці на дах яшчэ баявіты сусед Міцька. Яго таксама не *дапусціла* — як кажуць пра таемнае кіраванне ў Н. Адкрыць дзіру ў даху ўдалося аднаму Геніку, які быццам кот ускараскаўся на дах і без ніякіх перашкод выдзер патрэбную шчыліну.

Гапка Макаркава супакоілася і прызвала да сябе ўнука. Зараз адна яна ведала што рабіць, каб аблегчыць сваю смерць. Хоць не хацела такой долі свайму ўнуку! „Бачыла" свет, у якім людзі хадзілі як свінні, на чатырох нагах. Цікавіла іх адно карыта. Словам — ніякага прэстыжу і гонару ад дабрадзейства не атрымае яе ўнучак! Але справа рабілася незалежна ад іх. Будучы адвакат сам стаў на калені ля смяротнай пасцелі і папрасіўся:

— Я ўжо гатовы, — сказаў паміраючай.

Гапка Макаркава доўга шаптала яму нешта на вуха. Памерла яшчэ ў той самы вечар. Усю ноч, як клянуцца старажылы, была поўня, вылі ваўкі.

Ева СЦЕПАНЮК

У Градалях

Вёска Градалі, што ў Арлянскай гміне, налічвае больш за сто забудоў. Многія з іх ужо апусцелыя. Адзінай крыніцай даходу яе жыхароў з'яўляецца гаспадарка. Працуе тут прамыслова-прадуктовая крама і два пункты скупкі малака. Адзін належыць Бельскаму малочнаму кааператыву, а другі — Гайнаўскаму. Гэты апошні градалёўцы арганізавалі ў красавіку 2002 года. Цэны былі ў ім удвая большыя (у першым плацілі па 40 грошаў за літр малака, у другім — 80 гр.). Гайнаўскі пункт скупкі вядзе мясцовы солтыс Сцяпан Брэнька, які штодзень прымае каля 2 400 літраў малака ад шасцідзесяці пастаўшчыкоў з Дыдулёў, Дубяжына, Кошак, Пашкоўшчыны, Градалёў, Тапчыкал, Маліннік, Вулькі-Выганоўскай і Рыгораўцаў.

Уладзімір Астапчук трымае дзевяць кароў і штодзень пастаўляе больш за сто літраў малака, а Сцяпан Брэнька — сем кароў ды пяць штук ялаўняку. Пашы і сенажаці ў наваколлі хоць адбаўляй. У Градалі за сенам на зіму прыязджаюць сяляне з іншых гмін, напрыклад, Вышкаўскай ці Браньскай.

Вуліца ў вёсцы асфальтаваная, сядзібы акуратна задбаныя, з шыкарнай агароджай. Атракцыёнам з'яўляюцца два дыназаўры-веліканы на пляцы гульняў на пачатку вёскі.

Уладзімір СІДАРУК

Фальклор не забываецца

Пры сонечнай цёплай пагодзе 17 чэрвеня ў надрэчным амфітэатры ў Нараўцы адбыліся Павятовыя сустрэчы з народнай традыцыяй Падляшша і перш-наперш з фальклорам. Мерапрыемства арганізавалі Ваяводскі асяродак культуры ў Беластоку і Гмінны асяродак культуры ў Нараўцы.

На сцэне выступілі салісты, дуэты, тэрцэты і фальклорныя мастацкія калектывы з Гайнаўскага павета. Фальклорныя песні падабаліся гледачам. На Гайнаўшчыне традыцыя іх спявання будзе яшчэ доўга існаваць.

На ваяводскі агляд, які адбудзецца сёлета 30 ліпеня ў Ваневе (Высокамазавецкі павет), паедуць „Цаглінкі" са Старога Ляўкова і „Чыжавяне" з Чыжоў ды капэла „Дубіны", а таксама салістка Кацярына Ціханюк са Збуча (Чыжоўская гміна).

Журы ў складзе: Ядвіга Карпюк (старшыня), Сцяпан Копа і Мікалай Варанецкі адзначыла высокі ўзровень мастацкіх рэкамендацыяў фальклору сёлета на нараўчанскай сцэне. Такія знаёмствы будуць адбывацца. Дык да сустрэчы праз год у Нараўцы!

(мох)

Падляшша на фотавыставе

30 чэрвеня г.г. Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы па вул. 3 Мая, 42, запрашае агледзець пасляконкурсную фатаграфічную выстаўку „Партрэты гайнавян" і „Падляшша ў фотааб'ектыве". Адкрыццё выставы а 17 гадзіне.

(мох)

Лён з бел-чырвона-белым сцягам

Гурт „Ліцьвінскі хмель"

Многа можна было даведацца пра вырошчванне і апрацоўку лёну, з якога пасля ткалася палатно на вопратку ў час мерапрыемства „Нядзеля ільняных кашуль", якое 18 чэрвеня ладзілася на сходах і перад будынкам Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы. Перад публікай запрэзентаваліся два мясцовыя выканаўцы і калектывы з Беларусі, якія вопраткай і песнямі адклікаліся да часоў Вялікага княства Літоўскага, калі пачэснае месца на беларускіх землях займаў лён. Матыў сумавання па свабодзе, які прабіваўся ў адной з песень і прамове музыканта мінскага студэнцкага гурту „Рокаш", а таксама бел-чырвона-белы сцяг, пад якім выступалі замежныя госці, наводзіў на некаторых сабраных успаміны аб апошніх падзеях у Беларусі.

Аб здаровай ільняной вопратцы гаварыла Марыя Нічыпарук з Грабаўца, якую акружылі маладыя жыхары Гайнаўкі і сталі распытваць пра апрацоўку льну.

— Мне старэйшыя людзі расказвалі, што прыходзілася ім спаць па 3-4 гадзіны, каб справіцца са шматлікімі работамі і гэтага хапала ім на адпачынак. Зараз людзі спяць нават па дзесяць гадзін. Цела апранутае ў ільняныя ўборы не стамляецца так, як у вопратцы з хімвалакна, — заяўляе Марыя Нічыпарук.

Спадарыня Нічыпарук пачынае прасці, але пража, якая адлежала ўжо час сваёй прыгоднасці, крыху разрываецца.

— Нашы продкі стараліся сеяць лён на якасных чарназёмных месцах, бо тады ў ільне атрымлівалася моцнае сцябло. Лён, які рос на пясчаных землях быў крыху рыжаваты і пража з яго магла рвацца. Бывала ў мінулым, што гаспадары абменьваліся полем з суседзямі, каб пасеяць лён на найлепшых землях, што давала магчымасць вырабіць з яго найлепшае палатно, — кажа спадарыня Марыя. — Многа таксама залежала ад гаспадынь, якія займаліся апрацоўкай ільну. Вельмі важнай справай была ўмелая пража, якую можна было асабліва распазнаць на ручніках, якія віселі ў хатах побач ікон. Калісь хатнія работы патрабавалі вялікіх умесласцей і таму павольным і менш здольным жанчынам цяжка жылося.

Побач месца, дзе паказвалася апрацоўка льну, стаялі крамы з кніжкамі, ласункамі і народнымі вырабамі, а па музейным панадворку хадзілі маладыя людзі ў вопратцы часоў сярэдневякоўя і пазнейшых, на якіх былі, між іншым, вырабы з ільну. Вядучая мерапрыемства Альжбета Фіёнік, апранутая ў мясцовыя ўборы стогадовай даўнасці з Гацькоў і Маліннік, паінфармавала, што будуць выступаць беларускія князёўны ў вопратцы з XVI стагоддзя разам з каралевай Барбарай Радзівіл. Былі гэта дзяўчаты з Народнай студыі „Папараць кветка" Пружанскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі, якія прэзентавалі вопратку выкананую з мешкавіны і саломы.

— Усю вопратку нашы дзяўчаты выканалі самастойна. Спачатку мы бялілі тоўстую і калючую мешкавіну (ільняны матэрыял горшай якасці, з якога ў мінулым шылі мяшкі), а пасля яе малявалі. Уборы былі вышываныя, а эфектныя ўпрыгожанні выкананыя з саломы, — паінфармавала Вера Лапука, кіраўнік студыі і дабавіла, што за 7 гадоў дзейнасці падрыхтавала яна ажно 16 багатых калекцый і за свае поспехі студыя атрымала званне народнай.

Пасля перапынку дзяўчаты выступілі ў больш сучаснай ільняной мешкавой вопратцы ўпрыгожанай бісерам. У сярэдневякоўе вярнуўся старабеларускай, скандынаўскай і латышскай музыкай мінскі гурт „Ліцьвінскі хмель". Выступіў ён у вопратцы стылізаванай на часы сярэдневякоўя, якую выканалі студэнты на падставе захаваных з гэтага часу ўзораў. У даўняй вопратцы выступілі таксама ўдзельнікі калектыву „Рокаш" з Мінска, а частка іх убораў была выканана з ільну. Студэнты з „Рокаша" прэзентавалі фолькавую музыку з гістарычнымі тэмамі і матывамі. Заявілі яны, што трапілі ў Польшчу дзякуючы Арыне Вячорка (жонка старшыні Беларускага народнага фронту Вінцука Вячоркі), якая прысутнічала на гайнаўскім мерапрыемстве. Адна з песень гурту закранала тэму вольнасці.

— У нашай песні пра сокала паказана імкненне чалавека да свабоды. Гэтае намаганне актуальнае ў выпадку беларусаў, што вякамі змагаліся за нацыянальную вольнасць. Наш бел-чырвона-белы сцяг, з якім мы выступалі, гэта сімвал супраціву і змагання за свабоду бацькаўшчыны, — заявіў Станіслаў Багданаў з гурту „Рокаш". — Музыка ў нас свая або на матывы з сярэднявечча. Словы найчасцей на вершы нашага сябра Лявона Казакова.

У час мерапрыемства была добрая нагода прэзентаваць поспехі наймалодшых акцёраў, з якімі прыехалі іх бацькі. Прывезлі яны калаўротак і пражу, якія падыходзілі да тэмы сустрэчы. Дзеткі з Самаўрадавага прадшколля н-р 3 у Гайнаўцы выступілі з беларускамоўнай сцэнкай „Пра рыбака і рыбку", за якую на Аглядзе тэатральных калектываў у Гайнаўцы атрымалі першае месца. Дашкольнікі дэкламавалі вершыкі, з якімі паспяхова выступілі на дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова" і праспявалі песню „Шэры кот" з рэпертуару, які прэзентавалі на Музычным аглядзе творчасці нацыянальных меншасцей, дзе атрымалі ўзнагароду Гран-пры.

— Дзеткі вельмі ахвотна рыхтуюцца да конкурсаў і выступаюць перад публікай. У падрыхтоўцы да выступаў дапамагаюць бацькі, якія таксама па вёсках шукалі экспанаты (разбітае карыта ці калаўротак) для нашага прадстаўлення, — кажа Вера Масайла, якая працуе з дашкольнікамі.

Арганізатары мерапрыемства паінфармавалі, што ладзіцца яно ў рамках цыкла „Культура на музейных сходах" (у мінулым годзе адбылося 5 сустрэч).

— У гэтым годзе мы выходзім з новымі прапановамі і ў разбудаванай формуле будзем ладзіць спатканні з народнымі рамяствамі. З нашымі мерапрыемствамі маем намер выходзіць таксама па-за наш музей і Гайнаўку, — паінфармаваў дырэктар музея Ян Карпюк.

Гурт „Жэмэрва" Музея малой айчыны ў Студзіводах выступіў у народнай вопратцы. Аднак публіку зацікавіла перад усім прыгожае выкананне старых песень дзяўчатамі з розных мясцовасцей, якім старшынствуе Анна Фіёнік. Дарафей Фіёнік і дзяўчаты з гурту „Жэмэрва" паказалі яшчэ два веснавыя карагоды. Да танцуючых далучыліся асобы з публікі.

Тэкст і фота (ам-з)

Марыя Нічыпарук паказвала як пралі лён (збоку Арына Вячорка і Альжбета Фіёнік)

З надзеяй на Божую дапамогу

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вернікі маліліся на царкоўнай плошчы і вакол яе.

У Гайнаўцы і непадалёк ад яе распаложанай Крыначцы сёлетнія Свята-Троіцкія святкаванні доўжыліся тры дні. Доўгачаканае ацяпленне, якое прыйшло ў першы дзень свята, вернікі ўспрынялі як Божы дар і мнагалюдна наведалі святое і вельмі прыгожае месца ў Белавежскай пушчы, акружанае старымі дубамі і высачэзнымі соснамі.

11 чэрвеня вернікі гайнаўскіх і навакольных прыходаў сабраліся на літургіі ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы, якую ўзначальваў епіскап Гайнаўскі Міран. У прыздобленай зялёнымі дрэўцамі царкве свяшчэннікі і вернікі, стоячы на каленях, маліліся за сыход Святога Духа і прасілі Гасподняга блаславення на надыходзячы год. На другі дзень святкаванняў людзі з Дубінскага прыхода і прыпушчанскіх парафій сабраліся ўжо ў Крыначцы і маліліся там з мясцовымі святарамі, якія пасля асвяцілі ваду.

Хіба найбольшы паток вернікаў прыбыў у Крыначку на другі дзень святкаванняў, на ўсяночную багаслужбу. Традыцыйна, пасля абеду з гайнаўскага сабора выйшла паломніцтва ў пушчанскую царкву. Маладыя людзі неслі ў сэрцы падзяку за Божую дапамогу ў адукацыі і маліліся за ўспамогу ў арганізаванні свайго жыцця. Старэйшыя паломнікі ішлі з малітвамі за здароўе сваіх сямейнікаў і прасілі ў Госпада дапамогі для дзяцей і ўнукаў. Гайнаўскае паломніцтва выйшла на некалькі гадзін перад багаслужбай, каб не спыняць праезду машын і даць магчымасць вернікам спакойна памаліцца ў святых месцах і набраць свянцоную ваду. За асноўным паломніцтвам ішлі і ехалі на веласіпедах меншыя групы вернікаў. Пазней узносіўся туман куравы ад машын, якія амаль безупынна перамяшчаліся па вузенькай лясной дарозе. Чаму ж не асфальтаваць даязную дарогу ў Крыначку? Хутка пачала запаўняцца машынамі велізарная, загадзя абкошаная паляна за царкоўнай агароджай. Добра, што за парадкам на ёй наглядалі нанятыя людзі, якія пасля хутка сарганізавалі безаварыйны выезд такой вялікай колькасці машын.

Існуюць супярэчлівыя расказы наконт першых наведвальнікаў святога месца — Крыначкі. Ёсць меркаванне, што першымі насельнікамі наваколля Крыначкі былі манахі Кіева-Пячэрскай лаўры, якія скрыліся тут у XII стагоддзі ад татараў. Айцец Яўгеній Падгаецкі з Гайнаўкі лічыць, што названне „Крыначка" ўзнікла нядаўна і выводзіцца ад крыніцы, з якой выплываў ручай. Раней гэтае месца называлі „Меднае" (ад ручайка) і на дрэве паяўлялася тут ікона. Адносілі яе ў вёску Ліпіны, а яна зноў вярталася на дрэва. Побач гэтага дрэва вернікі збудавалі царкву, дзе зараз знаходзіцца прыгожая капліца і калодзеж. Мяркуецца, што сённяшняя вялікая царква збудаваная была толькі ў 1848 годзе.

Яшчэ да ўсяночнай багаслужбы вернікі ішлі да святой крыніцы, каб набраць там свянцонай вады ў слоікі і бутэлькі ды завезці сямейнікам. Ваду з Крыначкі людзі трымаюць цэлы год і выкарыстоўваюць у выпадку хвароб. Жанчыны і мужчыны адыходзілі ад калодзежа, прамывалі святой вадой хворыя месцы, выціралі іх загадзя падрыхтаванымі хустачкамі і пакідалі іх на жалезным плоце і кустах. Пасля святкаванняў каля калодзежа астаецца мноства хустачак і рознай велічыні кавалкаў палатна, якіх пазней збіраюць і паляць. Частка вернікаў лічыла, што нельга абціраць прамытыя асвячонай вадой рукі ці твар, каб не сціраць святасці і таму чакала ажно высахнуць яны на ветры. У мінулым здаралася, што людзі выбіралі амаль усю ваду з калодзежа. Сёлета выпала больш дажджоў і вады хапіла ўсім.

Вялікая чарга выстраілася перад нядаўна збудаванай капліцай. Мноства людзей пераходзіла каля сцен часоўні і прыкладалася да ікон ахвяраваных вернікамі. Усяночнае багаслужэнне і літургію на другі дзень узначаліў епіскап Гайнаўскі Міран у саслужэнні многіх святароў. Сярод вернікаў, якія адвячоркам прыбылі маліцца, пераважалі гайнавяне. У час літургіі на трэці дзень пераважалі вясковыя прыхаджане, якім вечарам папярэдняга дня трэба было займацца жывёлай.

Людзі, якія атрымалі выздараўленне або аблягчэнне ў хваробах пасля малітваў у Крыначцы, ахвотна прыязджаюць на святое месца разам з сямейнікамі. Аднак мала асоб рашаецца расказваць пра аздараўляльную моц святога месца і вады з Крыначкі. Некалькі гадоў таму жыхар Варшавы не скрываў, што дзякуючы абмыванню твару вадой з Крыначкі выляўчыся ад пухліны скуры. Сярод мясцовага насельніцтва захаваліся таксама расказы пра выздараўленні ад розных хвароб пасля абмывання хворых месцаў вадой з крыніцы. У вясковым насельніцтве замацаваўся расказ пра паню, якая абмыла ў Крыначцы сабаку і пасля гэтай падзеі лячэбнае ўздзеянне святой вады паменшала, аб чым расказваў мне і мой бацька. З заключэннем гэтага расказа не згаджаецца частка вернікаў, якая пастаянна наведвае святое месца ў Белавежскай пушчы. Лічаць яны, што прычына меншай Божай дапамогі для людзей заключаецца ў сённяшнім больш грахоўным жыцці, якое стрымлівае аздараўляльную ласку.

Вялікая колькасць паломнікаў пакідае ў Крыначцы многа грашовых ахвяраванняў, дзякуючы якім праводзяцца рамонты. Апошнім часам каля царквы ўзведзена была прыбудоўка, на якой у час Свята-Троіцкіх святкаванняў адбываліся багаслужэнні і новай бляхай прыкрыты быў увесь храм. Прадбачваюцца далейшыя рамонты, якія ўпрыгожаць лясную царкву. Не падыходзіць да святога месца агароджа з калючага дроту, якім абведзена ўся вялікая паляна. Гэтая агароджа аддзяляе Крыначку ад вайсковай часці і таму доступ да яе ў буднія дні складаны. Вернікі, якія раз'язджаліся дамоў з надзеяй на Божую дапамогу ў хваробах і жыццёвых выпрабаваннях, могуць наведваць святое месца ў час вячэрніх багаслужбаў па нядзелях у 16 гадзін.

Сёлетнія святкаванні навялі ўспамін аб сямейным юбілеі. Калі я наведаў сваю 97-гадовую бабулю Аляксандру, успомніла яна пра вянчанне з дзедам Юліянам, якое адбылося ў Крыначцы роўна 80 гадоў таму. Дабіраліся яны з будучым мужам і гасцямі з Арэшкава Дубінскага прыхода, а вянчанне адбылося пасля святой літургіі разам з іншымі дзвюма парамі з гэтай самай вёскі. Зараз жыхары Арэшкава, якія збудавалі сваю царкву і састаўляюць асобны прыход, таксама прыязджаюць у пушчанскую царкву памаліцца і абмыцца святой вадой.

Аляксей МАРОЗ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вернікі абмывалі святой вадой хворыя месцы, а хустачкі, якімі абціралі сваё цела, пакідалі на калючым плоце

Над вадой

У 2003 годзе ў водах Польшчы страціла жыццё 315 асоб, а ў наступным, на працягу толькі чэрвеня і ліпеня — трыста. Найчасцейшай прычынай тапленняў бывае рызыканцтва маладых людзей, купанне ў забароненых месцах і пасля выпіўкі. Многія асобы лёгкадумна скачучы ў ваду галавою ўніз, загадзя не разведаўшы дна, калі не гінуць на месцы, астаюцца паралізаванымі і калекамі да канца жыцця, асуджаныя на дапамогу іншага чалавека.

Для бяспекі купання важная і якасць вады. На тэрыторыі Бельскага павета ёсць толькі тры месцы, прызначаныя для купання — на рацэ Нарве каля адпачынковага асяродка недалёка Плёсак, адкрыты сезонна басейн Гарадскога асяродка спорту і адпачынку ў Бельску ды круглагадовы гарадскі басейн „Воднік", таксама ў Бельску — у іх за якасцю вады наглядае санэпідэмстанцыя.

У Плёсках станцыя правяла сем кантроляў, у ходзе якіх узята 28 доз вады для фізіка-хімічных і бактэрыялагічных лабараторных даследаванняў; матэрыял аказаўся ў межах нормаў.

Інакш было ў Бельску-Падляшскім. Тут зняты 26 доз вады, у тым ліку дзве з адкрытага басейна. У трох дозах, узятых з басейна „Воднік", выяўлена прысутнасць стафілакокаў (gronkowców). Праведзена абеззаражванне вады ў начных гадзінах з узбуйненымі параметрамі хларавання і азанавання. Паўторная праверка не паказала прысутнасці стафілакокаў. Апошнія дозы былі ў норме. Санітарна-тэхнічны стан аб'ектаў таксама задавальняў кантралёраў.

Пачаўся перыяд канікул, водпускаў і адпачынку. Будзьма разважнымі над вадой!

Міхал МІНЦЭВІЧ

Сустракалі лета

Вечарам у нядзелю, 18 чэрвеня г.г., на прыгожай палянцы пад магутнымі дубамі ў Свінароях (Нараўчанская гміна) плылі і плылі вясёлыя песні пад гукі гармоніка. Хто ехаў з Гайнаўкі ў Нараўку дык тут пры дарозе пачуў звонкія песні ды ўбачыў дым, які ўзвіваўся высока над кастром. Ля кастра прыемна праводзілі час пенсіянеры — жанчыны і мужчыны з Ляўкова, Падляўкова, Ахрымоў, Плянты, Нараўкі, Альхоўкі, Семяноўкі, Забрадоў, Тарнаполя.

Кампанейскі вечар пад назвай „Сустрэча з летам" арганізавалі Раённае праўленне Польскага саюза пенсіянераў (ПСП) і Гмінны асяродак культуры ў Нараўцы. Каб лепш спявалася ды танцавалася на сталы пад стрэшкай падалі смакавітыя дранікі, бігас, кілбаскі падсмажаныя на агні ды сырнік з трускалкамі. Да танца іграў Пётр Скепка, вядомы на Гайнаўшчыне музыка. Было весела і цікава. Арганізавалі рэчавую латарэю. Галоўным арганізатарам ды распарадчыкам танцаў была Ядвіга Карпюк, старшыня Нараўчанскага раённага праўлення ПСП.

Пенсіянеры ладзяць такія мерапрыемствы не ўпершыню. У чэрвеньскую пару гэтага года гулялі да 10 гадзіны вечара. **(мох)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 30 -

Грак адразу пасля таго, як абсохла на траве раса, вылецеў праз фортачку і сеў на парэнчы лаўкі. Лаўка каля вуліцы не была звычайная лаўка — доўгая дошка на чатырох стоўбіках-ножках, на якую час ад часу выходзяць пагрэцца на сонейку ды паглядзець на людзей перш за ўсё бабулькі. Лаўкі пад платамі наводзяць на людзей ахвоту паўспамінаць, асабліва тое былое, калі былося маладым і так ахвотна спявалася. А гэтая лаўка мае яшчэ старажытную спінку — ад старое драўлянае канапы, якую тата прымайстраваў да дошкі. Цяпер можна аперціся на тую спінку, на якую апіраліся натруджаныя спіны прадзедаў і прабабуль, і як тады паўспамінаць хочацца! Спінка паточаная шашалямі-шведамі, поўная дзірачак-норак, але трымаецца спраўна, і выразныя на ёй выразаныя лісткі ды галінкі вінаграду. Дзеўбануў Грак у такую дзірачку:

— Ёсць там хтосьці? Ці там ёсць шведы?

Спадар Шадар, што якраз шнырыў за чымсьці ў траве за лаўкай, ускараскаўся на лаўку і сеў.

— Тут ужо ніякіх шведаў няма. Высяліліся.

— А караеды? Мо караеды там жывуць? — не здаваўся Грак і соваў нос у пакручастыя дзірачкі.

— Караеды жывуць у жывой драўніне! — пазяхнуў спадар Шадар. — Эт, на гэтую канапу і легчы немагчыма. У маіх Казлоў мяккая канапа мае такую спінку, што расцягнуцца на ёй можна ўздоўж, лапы звесіць па баках, і спааа-аааць, мммм... Мяккенька. Ну, кінь ты дзяўбці, бо вібрыруе ўся лаўка, мне ў вуха коле.

— То чаго ты тут разлёгся? Расцягнуўся на палову лаўкі. Глянь, ідзе баба Стэпа, — Грак звочыў бабулю Сцепаніду, што з палачкай шнуравала ў іх бок.

— Пасуньцеся, спадар Шадар, — бабуля ветліва азвалася да ката, затое яе палачка была менш ветлівая — штурханула Шадара, можа не так і моцна, ды адчуў сваю крыўду. Падцягнуў сваё хвасцішча пад бок.

— Ну што, хлопцы, пра што разважаеце? — бабуля паправіла на носе акуляры. — Можа, заспяваем, калі ўжо тут паселі?

І зацягнулі разам утрое: „Цячэ-э-э ва-а-ада ў яр-р-р-ок, мяўўўў!..

Міра ЛУКША

Асьвета пад „ь” знакам!

Капітул „Мяккага знака” і Супернастаўніца Аліна Ваўранюк

Напрыканцы школьнага года, 19 чэрвеня г.г., як кожны год у Беластоку наладзілі ўрачыстае развітанне са школай. Наколькі сустрэча мела мастацкі характар, наладзілі яе ў будынку Ваяводскага асяродка анімацыі культуры, у г.зв. „сподках”. Разам з бацькамі з’явіліся госці з-за мяжы: з Нью-Йорка і Мінска. А Віктар Швед, спецыяльна для гэтай нагоды, напісаў і прачытаў верш „Мяккі знак”. Былі ўзнагароды, віншаванні і слёзы расстання. Аднак па чарзе...

Беластоцкія „развітанні” пачаліся з „Развітання” Пімена Панчанкі, які прадэкламавала лаўрэатка „Роднага слова” Наталля Швед. Верш гэты пра катастрофу беларускай нацыі. Гэта пратэст супраць абману і абыякавасці. Дэкламатарка сама падабрала твор. Ён сугучны з роздумамі сёлетніх выпускнікоў Гімназіі н-р 7, якія хадзілі на беларускую мову. Палова выпускнікоў будзе працягваць навучанне роднай мове ў III Агульнаадукацыйным ліцэі ў Беластоку. У планах — атэстат сталасці па беларускай мове. Справа надзейная, паколькі ўсе навучэнцы — выдатнікі або лаўрэаты прадметных конкурсаў.

— Гэта пачынальнікі, — кажа настаўніца Аліна Ваўранюк, — яны першыя ў Беластоку закончылі гімназію з беларускай мовай. На ўрокі, з першага па трэці клас, хадзіла 11 асоб, у тым ліку Ясміна Абоў-Гіляль, дзяўчына з польска-мараканскай сям’і. Усе выпускнікі атрымалі развітальныя ўзнагароды-кніжкі „Ад Полацка пачаўся свет”.

Гімназісты асабіста сустрэліся з аўтарам кнігі Уладзімірам Арловым у час мінулагодняй экскурсіі ў Беларусь. У сваю чаргу яны таксама ўзнагародзілі сваю настаўніцу: ад імя капітула *Мяккага знака* прысвоілі Аліне Ваўранюк ганаровае званне „Супернастаўніцы”! І да гэтага, у якасці статуэткі, падарылі рэльеф мяккага знака ў камяні.

— Дзякуем што паўтаралі нам: „Не думай ніколі, што ведаеш даволі!”

Словы падзякі і букет маргарытак гімназісты накіравалі таксама доктар Барбары Пякарскай, старышыні бацькоўскага камітэта АББА (Аб’яднання бацькоў беларускасцю апантаных).

У сваю чаргу віншавалі ўдзячныя бацькі гімназістаў, якія падарылі Аліне Ваўранюк ікону св. Алы. І бацькі навучэнцаў з „чацвёркі”, якія падарылі супернабор для вышыванак з узорам пецярбургскіх сабораў. Сло-

„Цацачная крама” Матвей Сэвастыянік

Ганна Пякарская

Мацей Карчэўскі

„Сінязорка"

„Зерне" - Барацьбы

вы падзякі і парцалянавы набор для гарбаты трапіў у рукі настаўніцы музыкі і танца Анны Бабік.

* * *

Паколькі мы ўжо пісалі пра тры сёлетнія пастаноўкі: „Сінязорка", „Цацачная крама" і „Зерне", дык зараз прывядзем словы гледача з Нью-Йорка. Алла Орса-Рамана, асоба ў свеце мастацтва аўтарытэтная, у мінулым праславілася як кіраўнік танцавальнага гурту „Васілёк":

— Я пад уражаннем, што шмат маладых сяброў ведае беларускую мову, што пазнаюць адкуль іх карані, гісторыю і што ведаюць пра што вядзецца барацьба. Па-другое: што ўсе тэатральныя прэзентацыі на такім высокім узроўні! Я паеду ў Амерыку і буду там пра вас расказваць, ставіць вас у прыклад.

Пры нагодзе мы пацікавіліся адукацыяй маладых беларусаў у Амерыцы. Самы вядомы адукацыйны цэнтр у Злучаных Штатах Амерыкі знаходзіцца ў Нью-Йорку. Заснаваны ў 50-я гады цэнтр знаходзіца ў квартале Бруклін.

— У нас адукацыя выглядае інакш як у Польшчы. Навучанне адбываецца ў г.зв. школках па суботах і нядзелях. На заняткі з'язджаюцца вучні з усяго горада і нават наваколля. Беларускія школкі знаходзяцца таксама ў Нью-Джэрзі і Саўт-Рыверы.

— У час выступлення Вы сказалі, што ведаеце ў Амерыцы пра нашых школьнікаў. З якіх крыніц?

— Ну, мы ведаем і чытаем вашу „Ніву"!

Тэкст і фота (гак)

Алла Орса-Рамана

Вершы Віктара Шведа

ЯК ПАЧЫНАЮЦЦА КАЗКІ?

Сынок да матулі прыйшоў:
— Растлумач мне, калі ласка,
„Жыла, была" — чаму з такіх слоў
Пачынаюцца ўсе казкі?

Матуля сыночку ў адказ:
— Часам казкі інакш пачынаюць,
І гэта здараецца не раз,
„Вечарам нараду маю".

НЕПАЎНАЛЕТНЯЯ МАЦІ

Пад кінатэатрам гарадскім
Стаяць сяброўкі без хлапцоў.
На кінафільм уваход не ўсім
Ад васемнаццаці гадоў.

Азвалася адна з іх так,
Непаўналетняя маці:
— Я не магу ўвайсці аднак,
Няма пакінуць з кім дзіцяці.

Тры Паўліны і Паўл

Дрэнны прыклад не патрабуе рэкламы, наадварот, ён мае поспех большы за тысячу рэклам.

Калі ў гімназіі пайшла чутка пра адыход Паўла, на перапынках запанавала паніка. Паказалася, што кожны другі вучань быў знеахвочаны сваёй школай, наракаў на настаўнікаў, на ўзровень навучання або на незвычайныя і арыгінальныя задумы Яна Дубалі. Словам, перашкаджала ўжо ўсё, нават самыя лепшыя і надзейныя справы.

І як не дзіва, мяняць школу першымі збіраліся дзяўчаты. У гэты момант яны былі гатовы памяняць сваю гімназію на самую слабенькую школу ў горадзе ці нават у глухой глыбінцы.

Апошні ўрок матэматыкі таксама быў незвычайны і пра яго гаварылі на перапынках. Ян Дубаля ведаў усе тыя чуткі пра бяду Паўла. І пра тое, што планаваны выезд Паўліны Ш. у Амерыку непазбежны. Ведаў таксама пра амбіцыю маладзёна і пра яго поспехі ў навуцы, якія часта заваёўваў дзякуючы дапамозе сяброўак. Ведаў пра яго правал па біялогіі.

— Хто адкажа мне на самае істотнае пытанне? — настаўнік падняўся з-за сваёй кафедры і захадзіў паміж партамі. Усе ўзіраліся ў Дубалю і чакалі. Паколькі гутарка завязалася на ўроку матэматыкі, усе спадзяваліся задачаў або рахункаў. Але Ян Дубаля думаў пра іншае:

— Адкуль узяўся чалавек? — спытаў ён.

— Ы...ы, — у класе пачуўся зрух. Гімназісты азіраліся, глядзелі на сябе з нейкім недаверам і пацікалі плячыма. Такое пытанне на ўроку матэматыкі? Няйначай — тут хітрыкі, закавычкі.

— Ну, якія ў вас веды па біялогіі? — настаўнік зірнуў у журнал з ацэнкамі. Пасля ахапіў сваю галаву рукамі і думаў. Гэта быў найстрашнейшы момант у жыцці Паўла. Гімназіст пабялеў, а пасля пачырванеў. І не чакаючы ўжо дадатковага пытання, падняўся з месца і ціха заявіў:

— Я думаю, што чалавека стварыў Бог!

Ян Дубаля паківаў галавой і адказаў сцішаным голасам:

— Простыя адказы найлепшыя. Я думаю... што ты думаеш! І што атрымаеш у мяне на канец не чацвёрку, — настаўнік красамоўна паглядзеў на вучняў, — а ... пяцёрку.

Спачатку Паўл не мог паверыць у сваё шчасце. Гэтая пяцёрка ратавала яму жыццё, ягоны гонар. Словам, усё! Так, дзякуючы пяцёрцы па матэматыцы ён атрымае пасведчанне з бел-чырвонай палоскай. І, — так прысягнуў сабе ў душы гімназіст, — напэўна астанецца ў гэтай школе. І па матэматыцы даб'ецца ў другім класе... шасцёркі!

У гэты момант Паўл зразумеў, што ўсе адмоўныя думкі пра школу ўзяліся з-за паганай двойкі па біялогіі.

І каб было смяшней, на перапынку ўсе ўжо гаварылі пра канікулы. І ніхто не збіраўся кідаць сваю гімназію, дарэчы, найлепшую ў нашым горадзе.

(працяг будзе)

АРАБІНКА

Польска-беларуская крыжаванка № 27



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантролньым талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 23: Нагода, крама, бэз, пастух, аўтар, моц, аўтамабіль, ток, ура,хор, мір, раліна, на, корак, ар. Які, паўтор, на, мастак, ло, там, мір, бура, Іна, грэх, бурак, мір, сола, на, аброць, дар.

Узнагароды, фотаальбомы, выйгралі: **Паўліна Лук'янюк** з Нарвы, **Магдаліна Мацеюк**, **Мажэна Дмітрук**, **Анна Анікюк** з Чыжоў. Віншуем!

СА СЛУЧАНКІ

— Што там такое нарадзіцца ў Беластоку! Хоць я сапраўды тут і нарадзіўся, у бальніцы, — смяецца Ігнат Карповіч. — Так і запісала ў маёй біяграфіі Моніка Шнайдэр, шэфіха выдавецтва: родам я са Случанкі. Гэтак адкрыла: гэта не абы-што — нарадзіцца ў Случанцы. А ў Случанцы цяпер жывуць мае бабулі.

Гэтак адкрываецца перад чытачамі кніжка Ігната Карповіча „Niehalo", якую выпусціла выдавецтва „Чарнэ". Гэтае выдавецтва адкрыла ў апошні час некалькіх пісьменнікаў і паэтаў, пазней намінаваных, а нават узнагароджваных літаратурнай узнагародай „Ніке" за найлепшую ў годзе польскую кнігу. Сарганізавалі ўрэшце сустрэчу з маладым аўтарам у Беластоку — гэтае спатканне ў кавярні „Фама", якая належыць Беластоцкаму асяродку культуры, было завяршэннем прамоцыі рамана ў Польшчы — папярэднія аўтарскія сустрэчы сарганізавала яму выдавецтва ў Варшаве, Познані, Вроцлаве, Кракаве і Бытаме. Бо кніга пра Беласток. А Ігнат Карповіч, народжаны ў 1976 г., таксама і не са Случанкі цяпер, і не з гэтага Беластока, а з усяго свету. Валодае англійскай, іспанскай і амхарскай мовамі, з якіх перакладвае, а жыве ён у Сярэдняй Амерыцы — у Кастарыцы, а ва Усходняй Афрыцы — у Эфіопіі. Усюды, мабыць, ведае правінцыйную глыбінку — зусім як кожную сцежку Беластока. За адзін дзень магістрант беластоцкай паланістыкі і журналіст-пачатковец з мясцовай газеты распраўляецца з польскай рэальнасцю і польскай гісторыяй.

— Ой, каб толькі не нарвацца на „ўсяпольскую моладзь", бо дастану, — палохаецца са смехам за свае нямодныя сёння (?) погляды пісьменнік. Мяне ўжо гэта сустрэла, такое *дабітнае* спатканне з імі, і, мабыць, тыя „іншыя" чытачы „Niehalo" ахвотна так патрактавалі б і іншых, шматліка сабраных у „Фаме" аматараў гэтай апісваючай парадоксы рэальнасці, дынамічнай, дасціпнай, іранічнай, горкай і смешнай кнігі і аўтара, разам з ягоным дваюрадным братам Лявонам Тарасэвічам, значыць, можа і прыйшлося б куляцца як у бітве пасярод Беластока прыхільнікаў „Арла і Пагоні" ды айца Мухамора з Радыё з Паллякамі супраць „Вестак Падляшша" і еўраэнтузіястаў. Ёсць тут і вандроўка з сышоўшымі з помнікаў Ежы Папялушкам і Язэпам Пілсудскім, гавэнды па-эсперанцку доктара Заменгафа таксама з бюста, цудадзейнае яйка, з-за якога ўсё тое тварыцца. Пачынаецца ж усё больш-менш рэальна, ад раніцы, калі герой выходзіць з кватэры на працу ў рэдакцыю (паводле дакладнай тапанімікі, працуе ён у... „Кур'еры паранным"), з якое выходзіць па малако для рэдакцыйнай гарбаты. Пачатковы рэалізм ператвараецца ў гіперрэалізм, каб пасля даць уяве пайсці сапраўды самапасам і давесці да сцэны проста як з фантасмагарычнага Армагедону ў ваколіцах Ратушы. І кроў пырскае з парэзаных вен, і лятаюць у паветры галовы цмокаў... Гэты свет апіраецца на мане — ігранні словамі герояў дробных і вялікіх, якіх узнеслі ўжо на помнікі, мане радыёмарыйнага і камуністычнага шаблону. І ўсё вяртаецца да зыходнага пункту. Сам аўтар кажа: „«Niehalo» гаворыць аб тым, што тварыцца, калі чалавек адклейваецца ад рэальнасці, а рэальнасць адклейваецца ад здаровага розуму". Крытыка Паўла Дуніна-Вансовіча, якога цяжка задзівіць і прымусіць да пахвалы, кніга Ігната Карповіча вельмі зацікавіла: „Карповіч моцна раскруціў патэнцыяметр з надпісам «уява». Мяжа паміж рэальнасцю і ўявай расплываецца. Адначасова, у адрозненне ад большасці сваіх аднагодкаў, аўтар «Niehalo» канфрантуе свайго героя з гістарычнай традыцыяй. У мяне склалася ўражанне, што нарадзіўся наступнік Канвіцкага".

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Кніга „Niehalo" гэта ўжо пяты вялікі твор Ігната Карповіча, які „піша — бо мусіць, піша, як дыхае", хоць першы выдадзены. Выслаў ён яго з Эфіопіі ў выдавецтва „Чарнэ", і кніга паявілася ў элітным цыкле „Краёвыя лініі".

— Чаму „Niehalo"? Такое пытанне ставяць мне часта. Герой адчувае рэальнасць як нейкую неадэкватную. Падымаючы трубку тэлефона, такса азываецца не „halo", а „niehalo". Я сам працую з тэлефонам — а то ехаць кудысьці трэба, а то штосьці не ўдалося, таму не люблю размаўляць па тэлефоне.

У планах у Ігната Карповіча новая кніга — раман пра каханне немагчымае: — Анна, гадоў 30, закахаецца ў мужчыну, гадоў 24, які завецца Мікола, у той момант, калі ён на яе вачах гіне. У такі момант каханне працягваць і рэалізаваць, як самі разумееце, цяжка. Да таго Міколава цела не гніе, захоўвае тэмпературу 36,6 градусаў, якая вельмі добрая для мужчыны ці жанчыны, але не для нябожчыка...

Міра ЛУКША

Непаўторныя крыжы

У мінулым годзе чакаў я ў Дубасне аўтобуса. Паколькі да яго прыезду аставалася шмат часу, хадзіў я то туды, то сюды ад прыпынку. Маю ўвагу прыцягнуў спакуслівы абрыс на ўзгорку ў адлегласці якіх трохсот метраў; падаўся я ў яго напрамку.

Цікавасць не заўсёды вядзе ў пекла. Перада мною вырас выдатны помнік нашай даўніны. На вялікім валуне край дарогі з Дубасна ў Новы Двор ляжаў вялікі камень, а на ім змацаваны выдатна захаваны чыгунны крыж з 1885 года. На прымацаванай да яго табліцы эліптычнага кшалту быў выразны надпіс. Змест надпісу складала прыгожая простая малітва ад фундатара па прозвішчы Ганчарук; і ніякіх іншых інфармацый. Прозвішча Ганчарук даволі папулярнае ў тамашнім наваколлі, таму найперш у яго ўладальнікаў стаў я шукаць больш звестак пра карані таго незвычайнага помніка: кім быў фундатар і ў якой інтэнцыі паставіў ён такі помнік.

Вынікі маіх апытанняў падвялі мяне ў густы туман, з якога паказаліся невыразныя абрысы паўстання таго помніка. Бо і памяць пра яго захавалася моцна парваная: у нямногіх людзей і да таго ж іх версія падалася мне сумессю гістарычных падзей з прывязанай да мясцовых рэаліяў выдумкай.

Захаваная яшчэ легенда згадвае, што на ўзгорку, дзе стаіць помнік, разыгралася бітва між мясцовым насельніцтвам і туркамі, якія напалі на вёску; узгорак у мясцовай тапаніміі называецца Туркавай гарою. Вясковым апалчэннем камандавалі Ганчарук і Ставорка.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Надпіс на крыжы на Туркавай гары

У гэтую легенду прыйшлося мне засумняваецца, бо неяк не магу прыпомніць ніякіх гістарычных згадак пра наезды турэцкіх войск на тутэйшыя землі. А бітва тая з туркамі магла сапраўды разыграцца і маглі ў ёй прымаць удзел Ставорка з Ганчаруком, толькі ў зусім іншым месцы, адлеглым ад Дубасна каля тысячы трохсот кіламетраў. Маю тут на думцы перавал Шыпку ў балгарскіх горах Старая планіна, дзе ў 1877-1878 гадах расійская армія змагалася з туркамі за вызваленне ад іх Балгарыі. У радах царскіх войск маглі быць рэкруты з Дубасна. І верагодна, што яны з балгарскіх гор не вярнуліся... Іхны сваяк сем гадоў пасля бітвы паставіў помнік, прысвечаны не толькі ім, не толькі расійскім салдатам — прысвечаны ён усім! А людзі, як гэта людзі, прывязалі адлеглыя падзеі да зямелькі, на якой стаў той помнік. Бо ж яшчэ гаварылася ў народзе, што на Туркавай гары знаходзілі косці — такая тут разыгралася бітва! Магчыма, што тыя астанкі паходзілі з прадаўняга часу, калі на той горцы маглі быць звычайныя могілкі, пасля забытыя, але ж у народным уяўленні можна было тыя косці прымеркаваць і да значна пазнейшага часу.

У самой вёсцы Дубасна перад адной з хат стаіць цэментны крыж. І ягоны фундатар таксама паставіў яго ў найшырэйшай інтэнцыі: „Господи Исусе Христіе Сине Божиі и Матерь Божая Красностоцкая Спасаіте Живых и Умершихъ С.К.П.И.Г. 1908 г." І быў ім жыхар Дубасна па прозвішчы Ганчарук. Ён працаваў на чыгунцы, дзяцей не меў, не было на каго расходаваць грошай і ён ахвяраваў іх у шляхетнай інтэнцыі.

На дубасенскіх хутарах, што ад Новага Двара, стаіць шмат навейшых металічных крыжоў. Адзін з іх стаіць на ростані дарог; у палове мая перад ім стаялі тры простыя лавы з дошак. У маёвыя вечары збіраліся там навакольныя жанчыны і супольна, без удзелу ксяндза, адпраўлялі маёвыя малітвы. Гэта свайго роду касцёл на прыродзе, пад нябесным купалам са своеасаблівым неафіцыйным жаночым свяшчэнствам.

Столькі пра тры крыжы. А іх жа намнога больш. І ў кожнага свая індывідуальная гісторыя, свая так назваць біяграфія, розная, як розныя біяграфіі ў людзей. Напрыклад, у пачатку суседніх з Дубаснам Хільмонаў стаіць побач сябе шэсць розных крыжоў. Іх ставілі, калі ў бойцы гінуў якісь хлопец. Бо бойка, гэта таксама своеасаблівая вайна, толькі ў мінімальным, індывідуальным маштабе.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Нарадзіўся ён у вёсцы Уснаршчына. Мала хто ведае, дзе яна распаложана. Мужчына з гэтай вёскі, якому я пазваніў (у тэлефоннай кніжцы зафіксаваны тры нумары), тлумачыць: „Гэта каля пяці кіламетраў за Ласінкай, ехаўшы на Трывежу".

Прафесар з Уснаршчыны

Нарадзіўся ён 62 гады таму на Беласточчыне. Дэбютаваў у канцы 60-х. Працуе выкладчыкам у Акадэміі мастацтваў у Лодзі. Тут вядзе адну з жывапісных майстэрняў. Апошняя ягоная выстава ў Беластоку і ў нашым рэгіёне адбылася больш за 20 гадоў таму, хоць выстаўляўся ў іншых рэгіёнах Польшчы і свету.



Гэта Мікола Давідзюк. Ад шасці гадоў мае ён найвышэйшую навуковую ступень — звычайнага прафесара. Ягоныя працы (алей на палатне) можна было глядзець у гарадской галерэі мастацтва *Galeria Willa* ў Лодзі: горадзе, які з'яўляецца месцам яго жыхарства. Нарадзіўся ён у вёсцы Уснаршчына. Мала хто ведае, дзе яна распаложана. Мужчына з гэтай вёскі, якому я пазваніў (у тэлефоннай кніжцы зафіксаваны тры нумары), тлумачыць: „Гэта каля пяці кіламетраў за Ласінкай, ехаўшы на Трывежу".

— Уснаршчына і тая зямля пакінулі ўва мне глыбокі след. З гэтага ніколі не вырастаецца. Ва Уснаршчыне няма ўжо маёй хаты і сям'і. Няма ўжо таго майго свету. Для мяне гэта свайго роду могільнік, гаснучае жыццё. Мая мама і сястра жывуць у Гайнаўцы. Прыязджаю сюды штогод летам, — расказваў мастак „Ніве" ў першай палове чэрвеня, тыдзень да закрыцця лодзінскай экспазіцыі.

— Творчасць Міколы Давідзюка з'яўляецца ўсё аднаўлянай спробай дайсці да нейкай, ледзь прадчуванай таямніцы; гэта няспыннае падарожжа ў глыб непазнавальнага, — апісвае мастацкі свет прафесара крытык мастацтва Івона Кляман.

З карцін на лодзінскай выстаўцы спаглядаюць вочы. Гэтыя вочы здаюцца захапляць творцу. Ці гэта ягоныя „віжы"?

— Малюю для таго, каб сабе на гэта пытанне адказаць. Шмат было тэорый на гэту тэму. Але я без вачэй не магу скласці карціны, — прызнаецца.

Вочы спазіраюць з моцна разнакаляровых, авальных і трохкутных формаў, нагадваючых твары. Кампазіцыя геаметрычных форм ды гулянне колерам здаюцца быць, аднак, важнейшымі.

— Калі глянем на жывапіс з нейкай перспектывы, то несумненна заўважым пераход ад вялікіх, змрочных, насычаных палотнаў з апошніх гадоў штудзіравання і пачатку сямідзесятых, да меншых па фармаце карцін з выразнай фактурай і абмежаваным, часта да аднаго матыву, ліку дэталяў. Навейшыя палотны характарызуе прамяністасць насычаных колераў і чысціня геаметрызаванай кампазіцыі, — апісвае мастацкую перамену Міколы Давідзюка Івона Кляман.

Сам мастак, калі распытвалі мы пра ягонае мастацкае крэда, прызнаўся „Ніве":

— Я ўжо ў такім узросце, што ў мяне ўжо няма крэда. Калісьці яно ў мяне было. Калі б я ўмеў акрэсліць яго словам, не маляваў бы! Шукаю ўнутранай мастацкай праўды. Тае складнасці, якой так вельмі не хапае ў сённяшнім свеце, у нашай цывілізацыі. Я не прадбачваю нічога загадзя. У працягласці творчага працэсу не ўтрымаеш уявы твора. Тое, што здараецца за гэты час, карэкціруе намеры. Трэба ў нейкі момант пайсці за карцінай.

І дадаў:

— У мастацтве першы прынцып гэта максімалізм. У адрозненні ад жыцця, у мастацтве нельга ісці на кампраміс.

Прафесар Мікола Давідзюк меў выстаўкі ў Беларусі, Швецыі, Вялікабрытаніі, Францыі. Шмат з яго карцін і каля дваццаці тысяч рысункаў знаходзіцца ў прыватных калекцыях і музеях, м.інш. у Польшчы і Беларусі. У сталіцы ягонай роднай старонкі меў выставы толькі два разы. У 1978 г. у Галерэі Арсенал, якой шэфстваваў у той час Мікола Валкавыцкі, і там жа дзевяць гадоў пазней, у 1987 г. Яшчэ раз паявіліся ягоныя працы ў 2000 г. на невялікай выставе ў агратурыстычнай гаспадарцы ў Лапічах, непадалёк Крынак, пры нагодзе Беларускіх трыялогаў, арганізаваных Сакратам Яновічам і ягонай *Villa Sokrates.*

— У 1987 г. гэта была вельмі сумная выстава, — успамінае аўтар. — Ледзь скончылася ваеннае становішча, прадчувалася, што нешта мусіць здарыцца.

З прэзентацыі ў Беластоку з другой паловы сямідзесятых памятае:

— Перад адкрыццём выставы выслаў я запрашэнне Сакрату Яновічу, якога я не ведаў, але шмат аб ім чуў. Адпісаў мне коратка: „Прыйду абавязкова і з жонкай". На вернісажы паявіўся хтосьці ў касцюме, коратка астрыжаны. Я падумаў, што, можа, нейкі мясцовы партыйны бонза. Прадставіўся. І гэта была для мяне неспадзяванка: той партыйнай „шышкай" аказаўся... Сакрат Яновіч.

Пакуль што Міколу Давідзюка з ягонымі працамі ніхто на Беласточчыну не запрашае. Не выключае, што можа выставіўся б у Беларускім музеі ў Гайнаўцы. Аднак:

— Там вельмі благое святло.

Аб сённяшняй выставачнай сітуацыі агулам кажа:

— Гэта проста фінансавая „брындза". У прынцыпе не існуе ўжо такая з'ява, як абмен выстаўкамі паміж музеямі і галерэямі. Кожны творца паказвае сябе або сваіх знаёмых.

У каталогу да лодзінскай выставы і ў час размовы з „Нівай" адзначыў:

— Сувязь паміж мастацтвам і акаляючай нас рэчаіснасцю не непасрэдная, як думаецца некаторым, і не палягае на прадстаўлянні ці апісванні яе на розныя спосабы. Агулам можна сказаць, што мастацтва ў дачыненні да рэчаіснасці выконвае ролю пэўнага дапаўнення, паколькі ўносіць у яе і пасрэдна ў наша жыццё тое, чаго ў іх найбольш не хапае. Таму вельмі цяжка гаварыць аб прагрэсе ў мастацтве. Прагрэс — ілюзія: у сапраўднасці справа ў адным і тым жа, хоць кожны раз у іншы спосаб. Форма зношваецца штораз хутчэй, паколькі належыць яна вонкавай рэчаіснасці. Затое змест мастацкага твора мы ўспрымаем адразу, значыць, ён вечны, і таму не падвяргаецца зменам.

Раіна СТЭФАНЧУК

„Забытых таямніцаў чар", „Zapomnianych tajemnic czar"...

Кніга з такой прыгожай назвай днямі ўбачыла свет на Беласточчыне. Яна — вынік агульнай працы настаўнікаў, вучняў і апантаных цудоўнай ідэяй пошуку таямніц мінулага людзей шаноўнага ўзросту, якія жывуць па абодва бакі Белавежскай пушчы.

Гэта двухмоўнае выданне (польска-беларускае) знаёміць нас з міфамі і легендамі, звязанымі з паходжаннем назваў асобных вёсак і паселішчаў, расказвае аб далёкай мінуўшчыне, адкрываючы чароўныя таямніцы.

Зборнік складзены з дзвюх частак — польскай і беларускай, — кожная з якіх прэтэндуе на самастойнасць, бо не з'яўляецца працягам папярэдняга варыянта. Пасярэдзіне — карта еўрарэгіёна, які ўключае ў сябе тры раёны беларускай тэрыторыі і Гайнаўскі павет з памежнай.

Кніга багата ілюстраваная Агнешкай Ціханюк, якая знайшла той адзіна правільны мастацкі падыход, каб перадаць дух таямнічасці зместу.

„Забытых таямніцаў чар" — гэта і назва праекта, складзенага Наталляй Герасімюк. Узваліўшы на сябе нялёгкія абавязкі каардынатара праекта, спадарыня Наталля да дробязяў прадумала ўсе напрамкі дзейнасці ўдзельнікаў гэтай карыснай акцыі. Семінары, лекцыі, сустрэчы з цікавымі людзьмі, экскурсіі, дыспуты, абмен групамі школьнікаў з мэтай навучыць збіраць матэрыял на памежнай тэрыторыі суседняй краіны і г.д. дапамаглі стварыць сапраўдны фаліянт. Цудоўна, што ў Наталлі шмат аднадумцаў, якія адразу паверылі ў яе задуму і актыўна ўключыліся ў яе здзяйсненне. Гэта найперш выкладчыкі мовы і літаратуры, гісторыкі, краязнаўцы, этнографы, а таксама вучні школ з Гайнаўшчыны і Камянеччыны.

Хочацца спадзявацца, што першая „ластаўка" з лагатыпам „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы" стане пачаткам цэлай серыі кніг аб родным краі і яго людзях.

Нона ЛУКАШЭВІЧ
г. Брэст

Паколькі гадаваць дзяцей, прышчапляючы ім беларускасць у цалкам рускамоўным альбо польскамоўным асяроддзі справа цяжкая, бацькі, якія лічаць сябе шчырымі беларусамі аб'ядноўваюцца...

http://dzietki.staronki.com

Гадаванне дзяцей час ад часу ставіць перад бацькамі пытанні, на якія часцяком не ўдаецца адразу знайсці адказ. Нягледзячы на тое, што разнастайнай літаратуры па гэтай тэматыцы больш чым дастаткова, бацькі неяк з большай прыязнасцю ставяцца да парад тых, з кім маюць агульны светапогляд. Паколькі гадаваць дзяцей, прышчапляючы ім беларускасць у цалкам рускамоўным альбо польскамоўным асяроддзі справа цяжкая, бацькі, якія лічаць сябе шчырымі беларусамі, аб'ядноўваюцца. Прынамсі так адбылося ў Мінску, дзе вынікам такога нефармальнага аб'яднання стаў сайт у Інтэрнэце, які так і называецца «Партал для бацькоў-беларусаў „Нашыя дзеткі"». Таму яны адпаведным чынам вітаюць сваіх наведвальнікаў, якія набяруць на сваім камп'ютэры адрас http://dzietki.staronki.com: «Вы завіталі на старонку, прысьвечаную выхаваньню беларускіх дзетак. Давайце пабудуем гэты сайт разам! Дасылайце нам свае напрацоўкі, ідэі, цікавыя тэксты, малюнкі і г.д. — усё, што можа дапамагчы бацькам-беларусам. Кожны сутыкаецца з падобнымі праблемамі і цяжкасьцямі, аб'яднаўшыся мы дасягнем посьпехаў прасьцей!»

Калі мы выходзім на сайт, перад нашымі вачыма адкрыецца цікавае выяўленне, якое больш нагадвае дзіцячую кніжку з устаўленай для дарослых інфармацыяй. Але гэта толькі на першы погляд. Калі ўчытацца ў тыя артыкулы і дасланыя лісты, то адразу ўбачыш і надзею, і цяжкасці беларускамоўных бацькоў, якія выбралі для сябе і сваіх дзетак беларускасць.

Сайт падзяляецца на тры традыцыйныя часткі, якія ў сваю чаргу дзеляцца як газетная старонка на артыкулы. Праўда, цалкам артыкулы не змяшчаюцца, таму кожны мае працяг пад словам-спасылкай «Далей». Рубрыкі, што размешчаныя злева, арыентаваныя на розныя перыяды жыцця не толькі дзіцяці, але і жанчыны, якая збіраецца стаць маці. Дарэчы, сайт збольшага прызначаны менавіта для жанчын. Бо акрамя парад па выхаванню дзяцей змяшчае інфармацыю па кулінарыі і спрабуе адказаць на пытанне што найважней: сям'я ці кар'ера?

Пералічваць карысці для маладых бацькоў, якія завітаюць да „Нашых дзетак" цяжкавата. Бо адзіны, па маіх даных, падобны сайт зроблены з вялікім густам і любоўю. Адзначу тое, што падалося найцікавейшым. А менавіта старонку „Гульні для дзяцей". Усім нам вядомыя кніжкі-размалёўкі тут знайшлі сваё электроннае ўвасабленне. Цяпер пад наглядам дарослых, зразумела, і з дапамогай „мышкі" малыя могуць размалёўваць карцінкі, якія ўзнікаюць на экране манітора. Але гэта не ўсё. У падрубрыцы „Мульты" знаходзяцца своеасаблівыя мультфільмы, змена кадраў на якіх залежыць ад жадання карыстальніка. А для расповеду аб тым, што дзіця бачыць на малюнках, дадаецца адпаведны тэкст. Вядома, падобныя гульні вельмі добра развіваюць разумовыя здольнасці дзетак.

Ну а для сур'ёзных дарослых найбольш цікавым падаецца рубрыка „Форум". Выйсце на яе знаходзіцца пад назвай сайта. Размовы там тычацца самых розных бакоў выхавання беларускіх дзетак ва ўмовах іншага моўнага атачэння, прынамсі таго, як да гэтага ставяцца іншыя „небеларускамоўныя" людзі.

На жаль, імёнаў аўтараў і стваральнікаў сайта мы не знойдзем. Толькі на старонцы „Пра нас" сціпла паведамляецца, што даны праект запушчаны „групай ініцыятыўных мамашак, якія сутыкнуліся з адной і той жа праблемай — як выхаваць дзіця беларусам у Беларусі". Здаецца, гэтыя мамашкі ведаюць, як вырашаць даную праблему.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Найвышэйшым лакальным дасягненнем стала першае месца і новы нацыянальны рэкорд у эстафетным бегу 4 па 400 метраў. Папярэдні лепшы вынік у айчыннай гісторыі быў зафіксаваны на сіднейскай алімпіядзе...

Беларусь, беларусы...

„Выбеглі" у суперлігу

Бліскучай перамогай беларускай жаночай дружыны скончыўся турнір на Кубак Еўропы ў 1-й лізе па лёгкай атлетыцы, што прайшоў у Празе. У сваёй групе беларускі апярэдзілі ўсіх суперніц (Італію, Чэхію, Ірландыю, Фінляндыю, Бельгію, Швейцарыю і Латвію). Такім чынам пасля пяцігадовага перапынку айчынныя спартсменкі вярнулі сабе месца ў суперлізе, дзе сабраныя мацнейшыя лёгкаатлетычныя каманды Старога свету.

Спабор на Кубку Еўропы праводзіцца паводле вельмі простай формулы. У кожным з 20 відаў праграмы за краіну выступае па адным атлеце ці па адной камандзе (у эстафеце). У адпаведнасці з занятым месцам налічваюцца ачкі (за 1-е — 8 балаў, за 2-е — 7 і гэтак далей). Далей сумуюцца балы ўсіх без выняткі ўдзельнікаў (прыкладам, зышоў з дыстанцыі — атрымаў нуль). Асноўнымі суперніцамі беларусак у сталіцы Чэхіі былі італьянкі і гаспадыні стадыёна. У выніку Беларусь набрала 126,5 пункта, Італія — 116, Чэхія — 102. Астатнія ўдзельніцы засталіся далёка ззаду.

Агульны поспех беларускам забяспечылі найперш поспехі ў бегавых дысцыплінах. Максімальную колькасць балаў нашай краіне прынеслі Юліяна Жаўнярук (дыстанцыя 400 метраў), Наталля Карэйва (800 м), Святлана Клімковіч (1500 м), Вольга Краўцова (5000 м), Вольга Воранава, Аксана Драгун, Алена Неўмяржыцкая, Анастасія Шуляк у эстафеце 4 па 100 метраў. А найвышэйшым лакальным дасягненнем стала першае месца і новы нацыянальны рэкорд у эстафетным бегу 4 па 400 метраў. Папярэдні лепшы вынік у айчыннай гісторыі быў зафіксаваны на сіднейскай алімпіядзе і трымаўся ажно 6 гадоў. Новы рэкорд усталяваў квартэт, у якім выступалі Юліяна Жаўнярук, Ірына Хлюстава, Ганна Козак, Ілона Усовіч. Трэба канстатаваць, што яшчэ ніколі Беларусь не мела такога падбору класных і перспектыўных „белых маланак". Так што эстафетная бронза, заваяваная нашымі дзяўчатамі ў камандавым спрынце на апошнім чэмпіянаце свету, была зусім невыпадковай.

У іншых відах праграмы першыя месцы з беларусак здолелі заваяваць Ірына Чарнушэнка-Стасюк (скачкі ў даўжыню) і Аксана Мянькова (кіданне молата). Акрамя пералічаных пераможцаў, на рахунку нашых шэсць другіх і адно трэцяе месца. А найбольш праблемнымі відамі для беларускай дружыны ўжо даўно ёсць бар'ерны бег, скачкі ў вышыню і з шастом.

На аналагічным Кубку Еўропы ў першай лізе беларускія мужчыны-лёгкаатлеты занялі 4-е месца. Толькі летась яны, перамогшы ў другой лізе, выйшлі ў вышэйшы дывізіён. Так што сёлетні вынік можна прызнаць станоўчым. Беларусаў у Празе апярэдзілі Бельгія, Швецыя і Чэхія. Ніжэй нас у выніковым пратаколе размясціліся Швейцарыя, Эстонія, Нарвегія і Аўстрыя. Што датычыць індывідуальнасцей, то варта пахваліць штурхальніка ядра Паўла Лыжына і кідальніка молата Дзмітрыя Шако, якія перамаглі ў сваіх дысцыплінах. Трэцімі сталі Аляксей Карпаў (бег 800 м), Леанід Вяршынін (400 м з бар'ерамі), Аляксандр Верабей (трайны скачок) і Аляксандр Малашэвіч (кіданне дыска). Галоўнае, што айчынныя лёгкаатлеты замацаваліся ў першай лізе. Цяпер трэба рыхтаваць плацдарм для больш важкіх дасягненняў.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Падарожжа па Гродзеншчыне

Як жыць, дык жыць для Беларусі,
А без яе навошта жыць...
(Ларыса Геніюш)

Не памятаю, хто сказаў, што чалавек, які не вандруе, пражывае толькі адну старонку свайго жыцця, а вандроўнік — некалькі. Гэта напэўна добра ведае старшыня Таварыства беларускай культуры ў Літве Хведар Нюнька, таму на працягу дзейнасці гэтай арганізацыі адбылося шмат цікавых падарожжаў.

Асабліва запомніліся Вільня-Сьвіраны-Рукойні-Кушляны-Жупраны-Арляняты-Крэва, Вільня-Мінск-Бобры-Орша-Віцебск-Полацк-Паставы, Вільня-Беласток і г.д. Гэтым разам адбылася экскурсія па Гродзеншчыне — Вільня-Гродна-Ваўкавыск-Зэльва-Сынкавічы-Слонім-Дзятлава-Ліда. Рана, а 6 гадзіне выехалі мы з Вільні, хутка праехалі мяжу, зрабілі прыпынак, выпілі кавы і паехалі ў Гродна, дзе нас чакаў Уладзімір Хільмановіч з сябрамі. Прыехалі мы ў дамоўлены час на вакзал, паставілі на пляцоўку машыны (адной кіроўца Васіль Акуневіч, другой — старшыня ТБК Хведар Нюнька) і пайшлі пешшу па старых вулачках Гродна, горада, які нам, віленчукам, дарагі тым, што ў ім жылі Васіль Быкаў і Зоська Верас, што жывуць Аляксей Пяткевіч і Данута Бічэль-Загнетава. Нашымі гідамі былі Вітаўт Парфененка з дачушкай Алесяй, якія любяць свой горад і добра ведаюць гісторыю, культуру. Нават той факт, што В. Парфененка нарадзіўся ў Гродне, а вышэйшую адукацыю атрымаў у Мінску, Санкт-Пецярбургу, Варшаве і вярнуўся ў родны горад шмат аб чым гаворыць. Свае веды, любоў да гісторыі, цудоўна перадаў дачушцы; яны дапаўняюць адзін аднаго. Мы ў першую чаргу наведалі музей Максіма Багдановіча, вядома, спецыяльны экскурсавод не спатрэбіўся, затым магілу маці паэта Марыі Апанасаўны Багдановіч. Потым хадзілі па вулачках, спыняліся каля архітэктурных помнікаў, музея А. Ажэшкі, пабывалі ў гродзенскім замку, заходзілі ў касцёлы, цэрквы, атрымоўваючы асалоду і задавальненне. Першы дзень нашага падарожжа закончыўся на кватэры Уладзіміра Хільмановіча, дзе нас чакала яго жонка Іна з маленькай Лерай і зусім маленькім Ромкам.

На другі дзень раніцай мы паехалі ў Ваўкавыск. Тут нашым экскурсаводам быў Васіль Акуневіч з жонкай. У гэтым горадзе яны бываюць раз у год, тут жыве сястра Васіля. Мы даведаліся адкуль пайшла назва горада. Наступным прыпынкам нашага падарожжа была Зэльва. Прыехалі да царквы, пастаялі каля помніка слыннай паэтцы Ларысе Геніюш. У гэтым мястэчку нас чакаў з багатай праграмай Юры Ткачук. Асноўнай мэтай нашага падарожжа было ўскласці кветкі, схіліць нізка галаву і пачытаць вершы на магіле беларускай патрыёткі, аддаць Ларысе Геніюш дань памяці ад удзячных нашчадкаў. Апошняй кропкай у Зэльве была кватэра Юры Ткачука, дзе нас зноў чакала яго жонка Ліля. Ён паказаў нам свае мастацкія працы, багатую бібліятэку, з захапленнем распавядаў пра сваіх сяброў паэтаў, мастакоў. Падараваў нам выдадзеную ім кніжку Генадзя Каўша „Кружныя шляхі". Мала ёсць такіх апантаных і адданых сваёй ідэі як Юры Ткачук.

Далей наш шлях прадоўжыўся ў Сынкавічы, тут мы былі ўражаны ад помніка XV стагоддзя, агледзелі старажытную царкву, пабылі на службе, затым накіраваліся ў Слонім, потым у Дзятлава і Ліду. Блукалі па вулачках старажытных гарадоў Гродзеншчыны, заходзілі ў касцёлы, цэрквы, спыняліся каля архітэктурных помнікаў, заходзілі ў рэшткі замкаў, фатаграфаваліся, сустракаліся з сябрамі, дзеячамі культуры, духоўна ўзбагачаліся. А паглядзець было што. Вандроўка была ўзгодненая з Уладзімірам Хільмановічам, які апекаваўся намі ў Гродне. Нават надвор'е вельмі спрыяла, паколькі насталі першыя цёплыя, сонечныя дні пасля халоднай вясны. Перад мяжой мы зноў зрабілі апошні прыпынак і, поўныя ўражанняў ад пабачанага і пачутага, вярнуліся ў Вільню.

Гэтым падарожжам мы „напісалі" яшчэ адну цікавую старонку свайго жыцця. Праехалі мы па Гродзеншчыне больш за 500 кіламетраў, вярнуліся позна вечарам, а спадар Хведар Нюнька сказаў, што праехаў бы яшчэ столькі, паколькі стомленасці не адчувалася. Наперадзе новыя планы, новыя сустрэчы, падарожжы.

Леакадзія МІЛАШ
Вільня

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Анна і Уладзімір Гаўрылюкі

Вясновыя вандроўкі (6)

У мінулым годзе гасцяваў я на Сёмуху ў Вярховічах на Беларусі. Сяголета не атрымалася. Першы дзень правёў я ў сямейным крузе, а на другі сабраўся ў падарожжа па Бельшчыне. Пачаткова рашыў паехаць у Пашкоўшчыну, каб даведацца пра Івана Снапа, які разам з Васілём Верамчуком з Вулькі-Тэрахоўскай быў на ссылцы, але ўрэшце адмяніў рашэнне.

Забраўшы з сабою ровар, рэйкавым аўтобусам а гадзіне 6.40 адправіўся я з Чаромхі ў Бельск-Падляшскі. Сышоў я з цягніка на прыпынку ў Ляўках. Ад пачакальні засталася адна руіна. Гайнаўскі пуць парастае маладой бярэзінай і хвайняком. Краявід больш напамінае Дзікі Захад, чым IV Рэч Паспалітую. Адсюль на ровары рашыў я дабірацца дамоў.

З чыгуначнага прыпынку да вёскі як рукой падаць. Даўней праз Ляўкі я з кінаперасоўкай у Райкі ездзіў. Вуліца была брукаваная. Зараз праклалі тут асфальтавае палатно.

На пачатку вёскі прыкмячаю шыкарную жалезную агароджу з пяццю крыжамі — двума драўлянымі і трыма цэментавымі. На табліцы чытаю надпіс: „Cmentarz żołnierzy niemieckich z I wojny światowej". Перад агароджай стаялі тры бярозкі-„маявіны" і быў рассыпаны аер (так даўней сяляне ўпрыгожвалі свае панадворкі ў дзень Святой Тройцы). Калі я рабіў здымкі, прыглядаўся мне мужчына з суседняй сядзібы. Вось што я пачуў ад 76-гадовага Уладзіміра Гаўрылюка.

— Даўней могільнік дасягаў хаты. На ім знаходзіліся дзевятнаццаць магілаў. Старажылы гаварылі, што тут было пахаваных васемнаццаць немцаў і адзін рускі. Пачаткова былі ўзведзены вялікі дубовы крыж і каменны. Драўляны састарэўся. Пры акупацыі немцы паставілі другі і абвялі могільнік калючым дротам. Адзін з аднавяскоўцаў гэты крыж паваліў, зацягнуў пад стадолу і спаліў. Сяляне ў 1975 г. паставілі цэментавы ў гонар памерлых. 15 верасня 2000 года гміна задбала пра агароджу. Калісьці, як была школа ў Ляўках, пры настаўніцы Віткоўскай могільнікам апекавалася школьная моладзь. Вучні прыносілі кветкі і ставілі лямпкі ў Дзень памерлых. Зараз могільнікам апякуецца вёска. А гісторыя трэцяга цэментавага крыжа вось такая, — працягвае мой суразмоўца. — Прыхаджанка Анна Парфянюк паставіла гэты крыж на могільніку ў Дубяжыне, але штосьці ёй не спадабалася і перавезла яго сюды. Змяніла толькі надпіс на таблічцы. Гэтая ахвяра мае зберагаць жыхароў вёскі ад агню і нешчаслівых здарэнняў. А на могільніку ў Дубяжыне Анна Парфянюк паставіла іншы помнік...

Да кампаніі далучаецца Гаўрылюковая жонка, Анна. Ёй 79 год. Гаспадар тлумачыць:

— Яна з Апакі выходзіць...

— А я з Кузавы, — дадаю з усмешкай. — Маё прозвішча — Сідарук. У нашай хаце партызаны немцаў пастралялі...

— Майго бацьку немцы разам са Стэльмахам у Белавежы павесілі, — заяўляе жанчына.

Маіх суразмоўцаў цікавілі падзеі 1944 года ў нашай хаце. Са свайго боку Анна Гаўрылюк расказала пра трагедыю сваёй сям'і ды аб тым, як пры саветах прыходзіла ў Кузаву ў ваенны гарадок паглядзець савецкія фільмы. Успомніла яна таксама аб сваяках, пражываючых у Кузаве і Чаромсе-Станцыі. З прыемнасцю пасядзеў бы я яшчэ з мілым сужонствам, але перада мною шмат дарогі і новыя сустрэчы.

За Ляўкамі канчаецца асфальт. У Райкі не больш як за паўтара кіламетра. Вуліца здавалася быць апусцелай. Толькі ў канцы вёскі прыкмячаю мужчыну на лавачцы непадалёк забудовы Валянціна Семенюка. Павярнуў я на знаёмы панадворак калегі. Гаспадара застаў я ў хаце. Селі мы на лавачцы побач дома. Калі я заявіў прыяцелю, што зайшоў на момант, каб аддаць яму раней зроблены здымак, дык калега напаў на мяне з кулакамі: „Ты ж абяцаў, што наступным разам зойдзеш у хату!" Пагадзіўся я. Валікава жонка пачаставала гарбатай і пячэннем. З нагоды Сёмухі і сустрэчы выпілі мы па чарцы зёлкавага віна, абмяняліся навінамі, успомнілі мінулае і сустрэчы на з'ездах карэспандэнтаў. Валік распытваў пра Васіля Петручука, Грышу Мароза, Хведара Хлябіча. Я прапанаваў калегу вярнуцца да даўнейшага супрацоўніцтва з рэдакцыяй. На гэта атрымаў адмоўны адказ: „Мы ўсё сказалі, што мелі сабе сказаць. Лішняга прыбаўляць не стану", — заявіў Семянюк. На развітанне даў мне дзве кніжкі: „Бандытызм НАТО" і „Найбольшыя ілгунствы і містыфікацыі ў гісторыі касцёла". На адыходным успомніў я просьбу ляўкоўскага суразмоўцы:

— Валодзя Гаўрылюк прасіў перадаць прывітанні, — заяўляю прыяцелю. — Гаварыў, што асфальт за Ляўкамі прадоўжаць, каб спалучыць з Дубяжынам...

— Абяцанкі-цацанкі, а дурному радасць, — іранічна канстатуе калега. — Два гады таму такое абяцалі, а зараз хвастом прыкрываюцца...

Распытваю пра дарогу ў Мокрае, бо задумаў жончыну сястру наведаць.

— Пры канцы вёскі, за святліцай, у правы бок павернеш. Дарога пясчаная, але праехаць можна.

Калі я стаў пад'язджаць да вёскі Казлы, выявілася, што дарога ў Мокрае разбітая трактарамі і на ровары немагчыма праехаць. Падаюся затым проста ў Дубяжын. Гравейка тут выраўнаная грэйдэрам. Паабапал дарогі забітыя калкі. Што і раз размінаюся з будаўнічымі самазваламі. У швагра ў Дубяжыне спыніўся я на святочны абед ды ў далейшую дарогу падаўся. Праязджаючы побач дубяжынскага могільніка, успомніў я дачушку і жончыных бацькоў, якія тут пакояцца. Сэрца крывёю аблілося, ажылі ўспаміны.

Мінаю чарговыя вёскі: Алекшы, Градалі, Маліннікі. Усё бліжэй хаты. У кожнай мясцовасці сустракаю знаёмых, праводжу размовы. І так дабраўся я ў Сухавольцы. Там дамовіўся я на сустрэчу з Уладзімірам Герасімюком, які абяцаў падкінуць мне цікавую тэму.

(працяг будзе)

Уладзімір СІДАРУК

Іх Малая Айчына

Тут адчуваюць сябе найлепш і бяспечна, бо тут іх праўдзівы свет. Іх Малая Айчына.

У Нараўцы (Гайнаўскі павет) заснавалі Аб'яднанне сяброў Нараўчанскай зямлі (АСНЗ) і пачалі дзейнічаць, м.інш. арганізаваць конкурсы, агляды кінафільмаў Тамары Саланевіч, летнія балі ў нараўчанскім асяродку культуры.

16 чэрвеня г.г. у Гмінным асяродку культуры ў Нараўцы падвялі вынікі конкурсу „Нараўчанская зямля ў вачах пакаленняў" ды ўручылі ўзнагароды. На мерапрыемства прыйшлі войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч, дырэктарка нараўчанскага Комплексу школ Марыя Леўша, актывісты АСНЗ і жыхары Нараўкі.

— Стараемся прыблізіць усё тое, што захавалася ва ўспамінах нашых бабуляў і дзядуляў, зберагчы некаторыя рэчы, між іншым, хатняга дэкору з мінулага стагоддзя, у тым ліку кілімы, макаткі, вышываныя ўручную ручнікі і кашулі. Хочам пакінуць след нашай традыцыі і абычаяў ды нашу гісторыю, — сказала старшыня АСНЗ Вольга Зданоўская-Місяюк.

Затым пераможцам конкурсу былі ўручаны грашовыя ўзнагароды і дыпломы. У катэгорыі літаратурных прац першае месца і ўзнагароду атрымаў „ніўскі" карэспандэнт Мікалай Варанецкі з Альхоўкі. Раўнапраўнае першае месца за вершы пра Нараўку атрымалі Марта Ясвіловіч, Кацярына Кот і Эвеліна Раманчук — вучаніцы Публічнай гімназіі ў Нараўцы. Журы высока ацаніла таксама „Хроніку вёскі Альхоўка" Тадэвуша Кшыжанскага.

За альбомы з рэпартажамі, інтэрв'ю і са здымкамі ўзнагароду атрымалі вучні нараўчанскага Комплексу школ, якія працавалі пад кіраўніцтвам настаўніц Аліны Расінскай, Аліцыі Лешчук і Кацярыны Рэент.

У катэгорыі пластычных прац вылучэнне атрымалі вучаніцы школы ў Нараўцы. У катэгорыі разьбы найлепшыя былі працы ў гліне членаў разбярскага гуртка, які вядзе Вольга Максімюк у Самаўрадавай святліцы ў Старым Ляўкове.

У фатаграфічнай катэгорыі журы вылучыла фотааматара Войцеха Пацэвіча з Нараўкі.

Арганізатар сёлетняга выдання конкурсу заявіў, што конкурс будзе аб'яўлены і ў 2007 годзе. Зараз плён конкурсу „Нараўчанская зямля ў вачах пакаленняў" можна агледзець на выставе ў ГАК у Нараўцы.

Пасля афіцыйнай часткі з цікавым займальным канцэртам выступіў калектыў „Цаглінкі" са Старога Ляўкова, які восенню будзе адзначаць 30-годдзе свайго існавання. Гледачы — арганізатары, лаўрэаты конкурсу і госці маглі з зацікаўленнем паслухаць прыгожых лірычных песень пра каханне ды на заканчэнне канцэрта развітальную песню „Чарка на пасашок".

(мох)

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Накład: 1000 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Рэдактар тэхнічны: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Мацей Халадоўскі, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2006 r. upływa 5 września 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2006 r. wynosi 28,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 49,00 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 70,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 72,80). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 84,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 93,80), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 109,20), Australia — 10,00 (kwart. — 140,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

СКАРБЫ БЕЛАСТОЧЧЫНЫ

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Ужо ў нас развялі страусаў. Зараз узяліся за дыназаўраў.

„Даўціпы"

Андрэя Гаўрылюка

Двух сябраў папівае піўцо.

— Ці ведаеш, — кажа адзін — што я да шлюбу не спаў са сваёй жонкай? А як ты?

— Гм-м-м... Не помню. А як яна называлася ў дзявоцтве?

* * *

Размаўляюць два загадчыкі банкаў.

— Што новага ў цябе? — пытае адзін.

— Адны клопаты; шукаем касіршу.

— Я чуў, што вы нядаўна прынялі на працу новую...

— І цяпер шукаем яе з грашыма.

* * *

— Як ідуць справы? — пытае Янка ў сябра, які два дні раней адкрыў краму.

— Жахліва. Пазаўчора прадаў адну пару нагавіц, учора нічога, а сёння кліент, што пазаўчора купіў нагавіцы, вярнуў іх назад.

* * *

Муж разбірае электраразетку, кліча да сябе жонку.

— Што табе трэба? — пытаецца яна.

— Патрымай гэты провад.

Жонка бярэ провад у руку.

— І што? — пытае муж.

— Нічога.

— Гм-м-м, відаць, фаза ў другім провадзе.

* * *

Янка прыходзіць п'яны дадому.

— Зноў піў! — крычыць жонка.

— Ведаю, ведаю.

* * *

У стаматалагічны кабінет уваходзіць бледны ад страху Янка.

— Прашу прабачэння, — звяртаецца да яго медсястра, — пана доктара сёння няма.

— А ці можаце мне сказаць, калі пана доктара зноў не будзе?

* * *

У шпіталі да раненага падыходзіць лекар.

— Што: самаход? — пытае.

— Ну.

— Захутка вы ехалі?

— Не, запавольна ішоў.

* * *

— Чаму хірург аперыруе ў масцы?

— Каб не аблізваць нажа.

Артыст

Быў ён мастаком у сапраўднасці
Што людзей даводзіў да радасці,
Калі розныя шальмоўствы тварыў
І моцных хваляванняў надарыў.

Быў ён нават добрым чалавекам,
Якому стала важным лекам
Пойла, дзе віднелі чэрап і косці;
Яно вяло яго да радасцей і злосці.

Умеў ён спусціць свае нагавіцы
Каб іх зместам усім пахваліцца
І якую жанчыну аж на печ загнаць,
Бо сябе хацеў героем паказаць.

І дужацца з другімі ён любіў,
Хаця быў чалавекам ужо немаладым.
Раз так ён саперніку парваў штаны
Што аж раз'юшана пабіліся яны.

Артыстам дваюрадны зваў яго брат,
За што атрымаў лаянку і грубы мат.
І бацька гэтаксама яго выхваляў,
Бо прыкладным гаспадаром назваў.

П'яны артыст падмяў раз жонку ўначы
Бо яе сабе данінаю лічыў.
Яна рванула ад яго, а ён яе
Да непрытомнасці загрэў па галаве.

Дзеці злякаліся, што маці не жыве
І да дзядоў памчалі паскарэй.
Прыбегла яго маці з плачам: — У турме
Згніеш за тое, што забіў яе!

А ён, як ашалелы, рвануў цераз вароты
І, хаця восень, пагнаўся на балота
І ў рэчцы патануў. А жонка ў хаце акрыяла.
Такі артыстаў эпілог, такая яго хвала. **(мп)**



Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — пагаворку.

1. абрэвіятура арганізацыі з Саветам Бяспекі = 11 __ 9 __ 10 __;

2. вышэйшы слой прывілеяванага класа ў буржуазна-дваранскім грамадстве = 3 __ 4 __ 5 __ 6 __ 7 __;

3. Бенядзікт XVI = 1 __ 2 __ 12 __ 13 __;

4. водар, арамат = 8 __ 19 __ 20 __;

5. хістальны рух у вадзяным, гукавым або электрамагнітным асяроддзі = 14 __ 18 __ 15 __ 16 __ 17 __.

(Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 21 нумара

Абак, бег, дуга, жыла, Ілі, перац, Сібір, цела.

Рашэнне: **Каб жылі, багацелі і спераду гарбацелі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем: **Лявону Федаруку** з Рыбал і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

02.07 – 08.07

Баран (21.03. — 19.04.) Маеш вялікі ўплыў на іншых — ахвотна пойдуць за табою. Добрае здароўе і прыемны настрой. Часцей хвалі іншых, не шкадуй іншым камплімментаў. Прытрымлівайся правіл дарожнага руху.

Бык (20.04. — 20.05.) Палепшыцца самаадчуванне, мінуць хранічныя нямогласці. Падумай аб тым, што хацеў бы ты дасягнуць у гэтае лета. Неўзабаве паявяцца акалічнасці, якія будуць спрыяць рэалізацыі тваіх планаў. Не шукай на сілу кахання; яно прыходзіць тады, калі яго найменш спадзяемся.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Пачне цябе насіць. Тваё каханне з цяжкасцю будзе бегчы за табою. Будзь ветлівы ў адносінах да асоб, з якімі не пагаджаешся. Не рассейвайся, давядзі свае справы да канца.

Рак (22.06. — 22.07.) На працы балаган, не будзеш ведаць, на чым стаіш. Кантакт з прыродай дапаможа табе сабраць думкі, шмат шпацыруй. Пазбягай нервовых і накачаных злосцю людзей, каб не набрацца ад іх.

Леў (23.07. — 22.08.) Пастаў на сваім! Ты поўны ініцыятывы, баявіты. Не спавальняй тэмпу і не адкладвай важных спраў. Нават найбольш адданыя партнёры патрабуюць незалежнасці, не прыглушай каханага празмерным кантролем.

Дзева (23.08. — 22.09.) Настаў вушы на розныя навінкі — тэхнічныя, кулінарныя, медычныя; у новых прапановах знойдзеш штосьці для сябе. Урэшце сядзь за камп'ютэр! Ва ўсім, што робіш, дбай аб дэталі, каб з-за дробнага недагляду не пацярпець страты.

Шалі (23.09. — 22.10.) Магутны Юпітэр адыме з-пад тваіх ног перашкоды. Гарачы час, але неўзабаве перадышка. Не забывай аб тым, што вырашыў. Будуць спакусы! Знайдзі час паляжаць на чымсьці цвёрдым.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Сам задзівішся сваім геніяльным ідэям! Марс паможа скінуць пару кіло. Дай намовіцца на сустрэчу, нават калі не будзе ахвоты; можа мець гэта цікавыя паслядоўнасці. Не рабі надзеі камусьці, каго не кахаеш.

Стралец (22.11. — 21.12.) Зялёнае святло на шляху да поспеху. Спрыяюць аж чатыры планеты, а ніводная не шкодзіць. Планы рэалізуй адразу, не чакаючы нагоды — якраз яна і ёсць. Асцярожна з высілкам, асабліва калі рэдка варушышся.

Казярог (22.12. — 19.01.) Перад табою цікавае знаёмства, можа нават і каханне. Не бойся навінак і змен, пастаўся да іх так, што будуць яны карысныя. Усмешку захавай для таго, хто на гэта заслужыў.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Справішся з пільнымі заняткамі. Канец сардэчных хваляванняў, шанц на трывалую сувязь. Будзь асцярожны наконт абяцанак лёгкага прыбытку.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Асцярожна з грашыма; нявыключаныя фінансавыя клопаты. Увядзі ў меню прадукты з магніем. Не пакідай хвастоў на працы, бо пасля не будзе часу іх адрабіць.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960